КАМПЕТЭНТНА
Аляксей БЯГУН: "БЕЛАРУСЬ НЕ ПРЫЗНАЕ ДВАЙНОГА ГРАМАДЗЯНСТВА" 2 стар.

СТАСУНКІ
ПОЛЬСКІ ІНСТЫТУТ У МІНСКУ НАЛАДЖВАЕ КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ 3 стар.

ДЫПКУР'ЕР 3 стар.

АФІША
ЧАРОЎНЫЯ МЕЛОДЫІ "ЗАЛАТОЙ СТРУНЫ" 4 стар.

ЗДЫМАЕЦЦА КІНО
ЯПОНСКІ РЭЖЫСЁР АСЭНСОЎВАЕ ТРАГЕДЫЮ ЧАРНОБЫЛЬЦАЎ 4 стар.

ХРЫСЦІЯНСКАЯ СТАРОНКА "ЖЫЦЦЁ І ВЕРА" 5 стар.

СУСТРЭЧЫ
ШЛЯХІ ПРЫВЯЛІ НА РАДЗІМУ 6 стар.

ПАЭТЫЧНАЯ ІМПРЭЗА
САНЕТЫ Валянціны АКОЛАВАЙ, ПРЫСВЕЧАНЫЯ Уладзіміру КАРАТКЕВІЧУ 7 стар.

ДЗІЦЯЧАЯ ЧЫТАНКА
УРОКІ ДЗЕДА УСЁВЕДА 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

4 снежня 2003 года, № 49 (2867) Цана 175 рублёў E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

ЯКАСЦЬ — ГЭТА ДАСЯГНЕННЕ

Выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей Сідорскі ўручыў узнагароды за дасягненні ў сферы якасці. Конкурс на суісканне прэміі ўрада праводзіўся ўжо пяты раз. За гэты час лаўрэатамі сталі 55 прадпрыемстваў і арганізацый розных галін прамысловасці і сферы паслуг. Цяпер названы яшчэ 15 самых дастойных.

Конкурс у гэтым годзе праводзіўся па пяці намінацыях: вытворчасць харчовых і нехарчовых тавараў, сельскагаспадарчай прадукцыі, вытворчасць прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння, аказанне паслуг, выкананне работ. Сярод лаўрэатаў — Мінскі маторны завод, ААТ "Гродзенскі мясакамбінат", ААТ "Лукомльэнергамантаж" і іншыя. Цяпер гэтыя і іншыя адзначаныя прадпрыемствы маюць права скарыстоўваць у маркіроўцы прадукцыі выявы эмблемы прэміі.

Як адзначыў Сяргей Сідорскі, сёння менавіта якасць вызначае становішча Беларусі на замежных рынках.

МТЗ НА АФРЫКАНСКІМ РЫНКУ

У мэтах пашырэння экспарту беларускіх трактароў прадстаўнік Мінскага трактарнага завода наведаў Анголу і ПАР.

У Анголе дасягнуты дамоўленасці аб стварэнні сервісна-збытавой сеткі трактароў "Беларус" ва ўсіх правінцыях краіны. Заключана таксама пагадненне з ангольскай кампаніяй "Tecnosantos LDA" на пастаўку ў снежні бягучага года і студзені 2004 года трактароў МТЗ.

У ПАР прайшлі перагаворы з прадстаўнікамі шэрагу дылерскіх фірм, у прыватнасці, з кампаніяй "Look Ahead Investments" падпісаны кантракт на пастаўку гэтай фірме дэманстрацыйнай партыі трактароў. Да канца студзеня 2004 года плануецца падпісаць з кампаніяй агенцкае пагадненне, згодна з якім на працягу 2004 года ў ПАР будзе ажыццяўляцца пастаўка трактароў "Беларус". Паралельна вядуцца перагаворы аб заключэнні агенцкіх пагадненняў з іншымі паўночнаафрыканскімі фірмамі.

Абмеркаваны таксама магчымасці пастаўкі трактароў МТЗ у Дэмакратычную Рэспубліку Конга, Замбію, іншыя краіны афрыканскага кантынента.

ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ПРАСТОРА ПАШЫРАЕЦЦА

У інфармацыйнай прасторы Беларусі за апошні час адбыліся значныя змены. Такі пункт гледжання выказаў міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч у ходзе Інтэрнэт-прэс-канферэнцыі ў Маскве, якая адбылася ў рамках XI Міжнароднай прафесійнай выставы СМІ "Прэса-2004".

На 1 лістапада бягучага года, паведаміў міністр, у Беларусі зарэгістравана 1 484 дзяржаўныя і недзяржаўныя перыядычныя выданні (для параўнання: на 1 студзеня 1995 года — 721 выданне). Газеты і часопісы выходзяць на беларускай, рускай, нямецкай, англійскай, украінскай, польскай мовах. Інфармацыйнае поле прадстаўлена таксама 8 інфармацыйнымі агенцтвамі, зарэгістраваны 182 тэлерадыёпраграмы. Актыўна развіваецца кабельнае тэлебачанне.

Сваю палітыку Міністэрства інфармацыі будуе ў строгай адпаведнасці з Канстытуцыяй і заканадаўствам краіны, цэнзура ў Беларусі забаронена законам, падкрэсліў міністр інфармацыі.

РАТАВАЛЬНІК "МАРЖАНЯТ"

Пяцігадовага Віцю Нароўскага і васьмігадовага Руслана Смаглюка выцягнуў з ледзяной вады камандзір аддзялення роты аховы Чыгуначнага раённага аддзела аб'яднання "Ахова" Віцебска Сяргей Шчытоў.

Здарылася гэта ў вёсцы Васількі, што ў Віцебскім раёне. Сяргей, які прыехаў у госці да бацькі, выйшаў на ганак дома і пачуў крык аб дапамозе. У саджалцы, што недалёка ад дома, тапіліся два хлопчыкі. Сяргей кінуўся на крык і выцягнуў дзяцей на бераг. Сяргею Шчытову за мужнасць уручана Грамата абласнога АСВОДа.

Фота БелТА.

НА ЗДЫМКУ: Сяргей ШЧЫТОЎ.

Падрыхтавала **Таццяна КУВАРЫНА.**

незабыўнае

Фота БелТА.

ГОМЕЛЬ АДЗНАЧЫЎ 60-ю ГАДАВІНУ ВЫЗВАЛЕННЯ ГОРАДА АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

НА ЗДЫМКАХ: гамяльчаніну Міхаілу КОРШАЛЮ давялося вызваляць родны горад; у час святкавання.

дзяржава і дыяспара

МІЖНАРОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ Ў РЫЗЕ

У Рыжскім Доме латышскага таварыства адбыўся Міжнародны фестываль беларускай народнай песні. Яго заснавальнікам і арганізатарам выступіў Саюз грамадскіх арганізацый беларусаў Латвіі. Падобны фестываль з удзелам самадзейных калектываў беларускай дыяспары і прафесійных выканаўцаў з Літвы і Эстоніі праводзіўся ў Латвіі ўпершыню.

Удзельнікаў фестывалю віталі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Латвіі Вадзім Ламкоў, міністр па справах грамадскай інтэграцыі Латвіі Нілс Муйжніекс, начальнік дэпартамента нацыянальнасцей Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Юрый Уральскі.

Удзельнікам мерапрыемства былі перададзены віншавальныя пасланні міністра культуры Беларусі Леаніда Гулякі і старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Станіслава Буко.

Больш як сто ўдзельнікаў фестывалю прадставілі разнастайнасць і самабытнасць багатай беларускай культуры. З вялікім поспехам прайшло выступленне фальклорнага ансамбля Белдзяржуніверсітэта "Неруш".

На вечары прысутнічалі каля 300 чалавек, у тым ліку дэпутаты латвійскага Саэйма, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, дзелавых і культурных колаў, сродкаў масавай інфармацыі, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны.

УЛАДЗІМІР ДЗЯРЖЫЦКІ АТРЫМАЎ ВІНШАВАННЕ З РАДЗІМЫ

Адбылася сустрэча Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Малдове Васіля Саковіча з Ганаровым старшынёй Беларускай абшчыны ў Рэспубліцы Малдова Уладзімірам Дзяржыцкім.

Пасол павіншаваў заснавальніка беларускай абшчыны з 85-годдзем з дня нараджэння, уручыў віншавальны адрас ад імя старшыні Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Станіслава Буко, а таксама падзяку пасольства, якой дыпламатычнае прадстаўніцтва адзначыла юбіляра за актыўную дзейнасць па стварэнні і станаўленні Беларускай абшчыны ў Рэспубліцы Малдова, намаганні па кансалідацыі суайчыннікаў, шматгадовую прапаганду беларускай культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Малдова.

У ходзе сустрэчы абмеркаваны вынікі дзесяцігадовай дзейнасці беларускай абшчыны, пытанні Кангрэса беларусаў Малдовы, які адбудзецца ў красавіку 2004 года.

спорт

"ЗАЛАТЫ ФУТБАЛІСТ"

Беларус Сяргей Алейнікаў увайшоў у спіс "залатых футбалістаў", складзены УЕФА.

Імёны 52 футбалістаў будуць увекавечаны ў Доме еўрапейскага футбола ў штаб-кватэры УЕФА ў Ньюоне, які адкрыецца да "залатога юбілею" Саюза еўрапейскіх футбольных асацыяцый у наступным годзе.

Вызначыць лепшага футболіста за апошнія 50 гадоў УЕФА прапанавала кожнай нацыянальнай асацыяцыі, і Беларуская федэрацыя футбола выбрала Сяргея Алейнікава.

Міхаіл МАЗАКОЎ.

РЭКЛАМА

кампетэнтна

Аляксей БЯГУН:

"БЕЛАРУСЬ НЕ ПРЫЗНАЕ ДВАЙНОГА ГРАМАДЗЯНСТВА"

У лістападзе 1991 года мы сталі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

12 лістапада 1991 года ўступіў у сілу Закон Рэспублікі Беларусь "Аб грамадзянстве". Такім чынам, жыхары краіны з грамадзян СССР ператварыліся ў грамадзян Рэспублікі Беларусь. І вось ужо 12 гадоў мы – грамадзяне незалежнай дзяржавы з усімі адпаведнымі атрыбутамі, у тым ліку нацыянальным пашпартам.

Новая рэдакцыя Закона "Аб грамадзянстве" з'явілася летась. Яна, як лічаць спецыялісты, адпавядае міжнароднаму, нацыянальнаму заканадаўству і дзяржаўным інтарэсам Рэспублікі Беларусь.

На 1 ліпеня 2003 года па віду на жыхарства ў нашай краіне пражывала больш 130 тысяч замежных асоб і асоб без грамадзянства. Штогод выдаецца каля 20 000 дазволаў на пастаяннае жыхарства ў Беларусі. Указам Прэзідэнта РБ грамадзянства нашай краіны за мінулыя 10 гадоў атрымалі 4 000 чалавек. А тых жа, хто меў права атрымання грамадзянства ў спрошчаным парадку, больш за 150 000.

Выходзіць з грамадзянства Беларусі значна менш людзей – каля 400 у год. Штодзень пашпартна-візавая служба атрымлівае лісты, прымае грамадзян-суіскальнікаў беларускага грамадзянства.

За тлумачэннем змен у беларускім заканадаўстве і каментарыем наконт правіл атрымання яго беларусамі, якія жывуць за мяжой, мы звярнуліся да Аляксея БЕГУНА, намесніка начальніка ўпраўлення пашпартна-візавай службы МУС Рэспублікі Беларусь.

— Закон Рэспублікі Беларусь "Аб грамадзянстве" прадугледжвае для беларусаў, асоб, якія атаясамляюць сябе з беларусамі, і тых, хто жыў на тэрыторыі нашай краіны, а таксама іх прамых родзічаў спрошчаны парадак атрымання беларускага грамадзянства.

– За які тэрмін гэтыя людзі могуць атрымаць наша грамадзянства?

— Працэдура прадугледжвае тэрмін два месяцы. Для гэтай катэгорыі людзей не прымяняецца цэнз аселасці. Займаецца разглядам пытання Міністэрства ўнутраных спраў, а адказнай з'яўляецца пашпартна-візавая служба. Хадайніцтва астатніх грамадзян разглядае ва ўстаноўленым парадку Прэзідэнт.

– Якія падставы для ўступлення ў беларускае грамадзянства павінны існаваць для астатніх грамадзян?

— Па-першае, пастаяннае пражыванне на тэрыторыі нашай краіны на працягу сямігадовага тэрміну і адсутнасць грамадзянства іншай краіны. Новая рэдакцыя закона трохі спрошчвае гэты момант. Раней мы былі абавязаны чакаць канчатковага рашэння краіны, ад грамадзянства якой чалавек адмаўляецца. Цяпер дастаткова волевыяўлення заявіцеля, доказам чаго можа быць даведка з кампетэнтных органаў аб падачы хадайніцтва аб выхадзе з грамадзянства іншай дзяржавы. Іншыя ўмовы — законная крыніца існавання на тэрыторыі РБ, веданне адной з дзяржаўных моў нашай краіны. Ну і, зразумела, гатоўнасць чалавека ўзяць на сябе абавязак паважаць Канстытуцыю і выконваць законы Рэспублікі Беларусь. Тэрмін пражывання на нашай тэрыторыі таксама можа быць скарочаны для асоб, якія маюць асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь у галіне навукі, мастацтва, спорту, тэхнікі ці валодаюць прафесіяй або кваліфікацыяй, якая ўяўляе цікавасць для нашай дзяржавы. Ёсць яшчэ адна катэгорыя асоб, якія калісьці мелі грамадзянства РБ ці права на яго, а іх бацькі або ўсынавіцелі выбралі для іх іншае грамадзянства. Да такіх асоб тэрмін аселасці таксама не прымяняецца.

– Як практычна выглядае прыняцце беларускага грамадзянства тымі, каго мы можам назваць этнічнымі беларусамі ці іх нашчадкамі?

— Калі чалавек жыве за мяжой, першае, што ён павінен зрабіць, — афіцыйна аформіць выезд з краіны на пастаяннае месца жыхарства ў Беларусь. Такім чынам ён засведчыць, што нічога не павінен сваёй краіне. Беларусь лічыць, што асоба, якая хадайнічае аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь, не павінна мець не выкананых абавязацельстваў перад краінай сваёй грамадзянскай прыналежнасці. Былі выпадкі, калі ўлады пэўных краін не прызнавалі пастанову аб грамадзянстве РБ з-за таго, што пры выездзе чалавек не выканаў усе неабходныя фармальнасці. У некаторых краінах гэта досыць проста: дзейнічае рэгістрацыйны парадак зняцця з уліку. Ёсць краіны, дзе працэдура даволі складаная. Выхад з грамадзянства мае дазвольны характар і патрабуе пэўнага часу. Наступны крок — неабходна вызначыцца з месцам жыхарства на Беларусі.

Трэба ведаць, што без віду на жыхарства ці грамадзянства ў РБ немагчыма купіць жыллё. І ўжо па месцы жыхарства трэба звярнуцца ў пашпартна-візавую службу з заявай аб прыняцці беларускага грамадзянства. Вельмі важна мець усе неабходныя дакументы. Трэба прадаставіць даведку аб тым, што ў кампетэнтных органах той краіны знаходзіцца заява аб выхадзе з яе грамадзянства. Гэта можна зрабіць ужо па прыездзе ў Беларусь у консульстве дзяржавы, дзе пражываў раней.

– Ці варта звяртацца наконт змены грамадзянства і да органаў дыпламатычнай службы Беларусі за мяжой?

— Так. Але нашы дыппрадстаўніцтвы прымаюць хадайніцтвы, як правіла, у выпадку выхаду з беларускага грамадзянства. Людзі імкнуцца ўсё ж такі спачатку выехаць з тэрыторыі краіны, ад грамадзянства якой збіраюцца адмовіцца. Такі крок успрымаецца мясцовымі ўладамі даволі негатыўна.

– З якімі праблемамі сутыкаюцца этнічныя беларусы пры атрыманні нашага грамадзянства?

— Па-першае, не заўсёды людзі могуць пацвердзіць блізкую роднасць з грамадзянінам Рэспублікі Беларусь ці тымі людзьмі, што згубілі беларускае грамадзянства з-за нейкіх прычын. Знішчаны архівы, і дакументы прадаставіць немагчыма. Тыя, хто вяртаецца з рэспублік Сярэдняй Азіі, сутыкаюцца са складанасцямі ў прадастаўленні дакументаў, якія выдаваліся ім у краінах пражывання. Даводзіцца ісці насустрач, і людзі пражываюць у Беларусі па віду на жыхарства да ўрэгулявання ўсіх пытанняў. Летась і ў пазамінулым годзе актыўна вывучалася пытанне рэпатрыяцыі беларусаў на радзіму і нават была спроба распрацаваць дзяржаўную праграму. Але з прычыны пэўных абставін гэта справа прыпынена.

– Наколькі практычна адрозніваецца статус чалавека з відам на жыхарства ад таго, хто мае грамадзянства?

— І той і другі маюць права працаваць. Выключэннем могуць быць толькі некаторыя спецыяльнасці, што патрабуюць наяўнасці грамадзянства Беларусі. Не грамадзяне не адбываюць тэрміновай службы ў арміі. Дзеці людзей, якія маюць від на жыхарства, як і грамадзян РБ, вучацца бясплатна. Тыя, хто пастаянна пражывае на нашай тэрыторыі, маюць права набываць ва ўласнасць нерухомасць у любым населеным пункце Рэспублікі Беларусь.

Галоўнае адрозненне: грамадзянін РБ знаходзіцца пад абаронай дзяржавы як на нашай тэрыторыі, так і за яе межамі. Замежны грамадзянін ці асоба без грамадзянства пры выездзе за мяжу не можа разлічваць на абарону Рэспублікі Беларусь і ў выпадку якіх-небудзь праблем павінен звяртацца па абарону да прадстаўніцтваў улад краіны сваёй грамадзянскай прыналежнасці.

– Трэба звярнуць увагу і на тое, што беларускае заканадаўства не прадугледжвае двайнога грамадзянства...

— Так. І гэта супадае з асноўным прынцыпам, які ёсць у еўрапейскай канвенцыі аб грамадзянстве і мае мэту скараціць выпадкі, калі людзі маюць двайное ці не маюць ніякага грамадзянства.

Практыка паказала, што міжнародныя пагадненні — самыя прымальныя сродкі ўрэгулявання тых праблем, якія з'явіліся ў выніку распаду СССР, у тым ліку звязаных з пытаннямі грамадзянства. Першае пагадненне было з Казахстанам. Распаўсюджваецца яно толькі на асоб, якія змяняюць месца жыхарства, пераязджаюць з Беларусі ў Казахстан і наадварот. Умова спрошчанага атрымання грамадзянства прадугледжвае пастаяннае пражыванне на тэрыторыі адной з краін, пражыванне там да распаду СССР ці наяўнасць прамых родзічаў на тэрыторыі краіны, грамадзянства якой збіраюцца атрымаць. Уступіла ў сілу таксама пагадненне ў межах мытнага саюза паміж Казахстанам, Кыргызстанам, Беларуссю і Расійскай Федэрацыяй. Трэцяе пагадненне было заключана з Украінай. Ва ўсіх пагадненнях ёсць норма: калі асоба набывае грамадзянства іншай краіны, то папярэдняе губляецца. У нашым законе прадугледжана практычна тое ж самае: за асобай-грамадзянінам РБ не прызнаецца грамадзянства іншай краіны. Калі чалавек набывае грамадзянства іншай краіны, на тэрыторыі Беларусі мы прызнаём толькі наша грамадзянства, пакуль ён не заявіць аб выхадзе з беларускага грамадзянства ці не страціць яго па заканадаўству РБ. Такім чынам, Беларусь не прымае двайнога грамадзянства.

Гутарыла **Алена СПАСЮК.**

выстава

БЯСПЕКА РУХУ

У МІНСКУ ПРАЙШЛА 7-я СПЕЦЫЯЛІЗАВАНАЯ МІЖНАРОДНАЯ ВЫСТАВА "АЎТАБЕЛСЕРВІС. БЕЛТРАНССЕРВІС-2003".

У выставе ўзялі ўдзел 80 прадпрыемстваў і арганізацый з Беларусі, Польшчы, Літвы, Расійскай Федэрацыі, Украіны, Германіі, Турцыі.

У апошнія гады колькасць транспартных сродкаў у нашай краіне значна павялічылася. Дзесяць гадоў таму ў Беларусі налічвалася 989 тысяч транспартных сродкаў, а летась ужо 2 мільёны 639 тысяч. І рост колькасці машын працягваецца прыкладна на 9–12 працэнтаў у год. А па аб'ёму грузаперавозак Беларусь займае адно з вядучых месцаў у Еўропе. Усё вышэйзгаданае павялічвае нагрузку на адпаведную інфраструктуру — дарогі, аўтазаправачныя станцыі, аўтасервіс, паркінг. Аднак відавочна, што ўзровень развіцця апошняй адстае ад тэмпаў развіцця парка аўтамабіляў.

Выстава мела раздзелы "Дарога", "Транспарт", "Бяспека", іншыя. Мэта экспазіцыі — прадэманстраваць айчынныя і замежныя дасягненні ў галіне вытворчасці і эксплуатацыі транспарту, рамонту, абслугоўвання аўтамабіляў і ўсёй інфраструктуры ў цэлым — сервіса, дарог, бяспекі. Апошняя стала адной з самых важных тэм на выставе: дэманстраваліся прыборы для праверкі вадзіцеляў на наяўнасць алкаголю ў арганізме, сучасныя відэарадыёлакацыйныя комплексы, вымяральнікі хуткасці руху, мабільныя відэафіксатары.

Падчас выставы прайшлі семінары і спецыялізаваныя прэзентацыі. Праведзена акцыя "Спартсмены за бяспеку дарожнага руху", якая мела мэту прыцягнуць увагу да ўдасканалення вадзіцельскага майстэрства як яшчэ аднаго сродку зніжэння аварыйнасці на дарогах.

НА ЗДЫМКАХ: тэхніку для інспектараў дарожнага руху прадставіла Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя; абсталяванне для рамонту і абслугоўвання аўтамабіляў.

Алена СПАСЮК.

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

прызнанне

ПЕРАМОЖЦЫ "ЛІСТАПАДА"

У Палацы Рэспублікі адбылося ўрачыстае закрыццё X Мінскага міжнароднага фестывалю "Лістапад".

Галоўны прыз — "Золата "Лістапада" глядацкае журы на чале з Рычардам Смольскім аддало нашумелай і атрымаўшай "Залатога Льва" на сёлетнім Венецыянскім фестывалі драме "Вяртанне" Андрэя Звягінцава. "Серабро "Лістапада" атрымаў фільм "Бабулі" Генадзя Сідарава, а "Бронзай "Лістапада" адзначана наша "Настасся Слуцкая" Юрыя Ялхова.

Прыз за лепшую рэжысуру ўручаны Віталю Мельнікаву за фільм "Бедны, бедны Павел", Віктару Сухарукаву — за лепшую мужчынскую ролю ў гэтай жа карціне і Дануце Стэнка — за лепшую жаночую ролю ў фільме "Шапэн. Прага кахання" Ежы Антчака і Ядвігі Баранскай.

На думку ўдзельнікаў, фестываль прайшоў надзвычай удала.

Галіна ВІР.

здарэнні

ВЫНЕСЕНЫ ПРЫГАВОР РАБАЎНІКАМ РАРЫТЭТАЎ

Гэта адно з самых гучных злачынстваў года. Сярод белага дня, літаральна на вачах у работнікаў Нацыянальнай бібліятэкі, злачынцы вынеслі з аддзела рэдкай кнігі старажытныя выданні, сярод якіх быў і фаліянт, датуемы XV стагоддзем. На шчасце, кнігі хутка знайшлі і вярнулі з Масквы ў бібліятэку, а рабаўнікоў затрымалі.

І вось у судзе Ленінскага раёна Мінска аб'яўлены прыгавор па гэтай справе. Арганізатараў злачынства суд першай інстанцыі асудзіў да 10 і 9 гадоў пазбаўлення свабоды з адбываннем пакарання ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Непасрэдныя "несуны", якія выкрадалі кнігі з бібліятэкі, асуджаны да 5 і 3 гадоў пазбаўлення свабоды. Ва ўсіх асуджаных "кнігалюбаў" будзе канфіскоўвацца маёмасць.

Канстанцін СЕЛЬСКІ.

стасункі

КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ

З 30-га лістапада па 15 снежня ў Віцебскай абласной філармоніі праводзіцца XV Міжнародны фестываль імя І.Салярцінскага. Цыкл лекцый чытае старшыня Саюза польскіх кампазітараў Е.Станкевіч. Гэта заключны акорд вялікага, насычанага і надзвычай цікавага фестывалю "Восень з польскай культурай", наладжанага Польскім інстытутам, што працуе ў Мінску. Афіша фестывалю, які пачаўся 30-га верасня, знаёміла не толькі з яго мерапрыемствамі, але і з календаром асноўных культурных падзей у Польшчы. Увогуле праграма скіроўвалася на развіццё ўзаемных кантактаў і ажыццяўлялася ў розных накірунках.

Дзесяты год Польскі інстытут у Мінску знаёміць жыхароў Беларусі з польскай культурай, навукай і мастацтвам. Кожны квартал тут рэалізуецца больш за 20 праектаў, якія анансуюцца ў прэсе. Акрамя гэтага, наладжаны двухгадовыя курсы ў Мінску, Віцебску і Гомелі і гарадскім пасёлку Івянец Мінскай вобласці. Уся дзейнасць інстытута служыць збліжэнню польскага і беларускага народаў, абмену ідэямі і супрацоўніцтву. Такія інстытуты як самастойныя адзінкі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Польшча ажыццяўляюць культурную дыпламатыю ў 16 краінах Еўропы. Дырэктарам Польскага інстытута ў Мінску з 2000-га года з'яўляецца Цэзары КАРПІНЬСКІ. Гутарыць з ім наш карэспандэнт Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

– Пан дырэктар, у праграме фестывалю "Восень з польскай культурай" адчуваецца рука і творчае бачанне таленавітага рэжысёра, кім вы і з'яўляецеся па прафесіі. Хто або што дапамагло вам так дакладна зразумець цікавасць беларускай грамадскасці і скласці такую разнастайную праграму?

— У гэтым фестывалі — праца розных людзей, не толькі мая. Шмат хто супрацоўнічае з намі, іх цікавіць Польшча, якую яны бачаць як краіну, блізкую ім. Гэта людзі з розных асяродкаў, пералічэнне якіх заняло б шмат часу. Мы хочам супрацоўнічаць з Беларуссю, і на Беларусі многія да гэтага імкнуцца. Прапануючы сваё бачанне, прыслухоўваемся і да прапаноў беларускага партнёра. Калі я прыехаў у іншую краіну з пэўнай місіяй, то мушу быць «эластычным», каб ажыццявіць задуманае, перш за ўсё ўлічыць патрэбы тых, для каго прызначана мая праца.

– Вельмі цікава тое, што Польскі інстытут адкрыты для ўсіх. Вы працуеце не толькі ў сталіцы, але і ў абласных, нават раённых цэнтрах.

— Так, мы лічым, што суседзям ёсць пра што пагаварыць і што абмеркаваць, яны павінны больш ведаць адзін пра аднаго. А ў апошнія гады як Беларусь амаль не мела інфармацыі пра Польшчу, так і Польшча — пра Беларусь. Гэта не наша віна, але для таго і створаны наш інстытут, каб запоўніць гэты прабел. На жаль, дамова ў 90-я гады мінулага стагоддзя пра стварэнне аналагічнага беларускага інстытута ў Польшчы так і не была ажыццёўлена. Часам гэта ўскладняе нашу працу, бо беларусы звяртаюцца да нас з тымі праблемамі, якія змог бы вырашаць беларускі інстытут, працуючы ў нашай краіне. Але мы рады, што людзі цікавяцца, прыходзяць на нашы мерапрыемствы — значыцца, нам нешта ўдаецца. Некаторыя застаюцца, каб пагутарыць, абмеркаваць убачанае і пачутае. Асабліва моладзь вельмі адкрытая да кантактаў. Яна хоча ведаць, што адбываецца ў Еўропе, для яе важная перспектыва. Не хачу сказаць, што нам заўсёды ўдаецца здзейсніць задуманае, але не памыляецца той, хто нічога не робіць. І калі мы прэзентуем нешта цікавае, то робім гэта з адказнасцю і ўсведамляем, што папулярызуем сучасную польскую навуку, культуру, мастацтва.

– Магчыма, цікавасць да гэтых з'яў з беларускага боку ўжо праяўляецца ў прапановах на далейшае супрацоўніцтва – арганізацыя гастроляў польскіх тэатраў, новых выстаў, канцэртаў, праектаў.

— Прапановы ёсць, яны будуць разглядацца. Але я не пра ўсё ведаю, бо часам Польскі інстытут толькі дае магчымасць для нейкіх кантактаў, а потым усё ідзе ўжо праз гэтыя наладжаныя сувязі. Павінен сказаць, што з польскага боку ёсць пэўная насцярожанасць, калі мы ўпершыню запрашаем прыехаць на Беларусь. Але кожны, хто тут пабываў, спаткаўся з калегамі, меў які-небудзь канцэрт або лекцыю, ад'язджае ўжо зусім з іншымі пачуццямі, бо разумее, якія тут чулыя людзі, якая ўдзячная публіка, і звычайна настроены прыехаць яшчэ і супрацоўнічаць.

– Дасягнуць такога выніку, пэўна, няпроста?

— Кожны поспех, кожная справа мае два бакі, як манета. Толькі мы ніколі не гаворым пра адваротны бок, бо мытня, аэрапорты, нейкія нашы праблемы — гэта гледача не датычыцца. Усе, хто займаецца міжнародным абменам, ведаюць пра цяжкасці, якія маем і мы. Але як зрабіць, каб праблемы, якія ўскладняюць культурны абмен, не паўтараліся? Слова "культура" — паняцце шырокае. Напрыклад, кожны раз бываюць шматгадзінныя затрымкі на мяжы. Калі везлі экспанаты на першую археалагічную выставу, то мытнікі трымалі яе 16 гадзін, а як везлі назад — 24, другую археалагічную выставу — 12 гадзін. Летась ехаў сюды сімфанічны аркестр, то артыстаў затрымалі на ўсю ноч. Не толькі людзі, але і музычныя інструменты не могуць на марозе знаходзіцца, яны псуюцца ад гэтага. Мы гаворым пра талерантнасць, дружбу і культуру, а на справе атрымліваецца не заўсёды так. Мне цяжка гэта зразумець. Колькі разоў нам ужо абяцалі "свабодны калідор", але яго няма. Ёсць пэўныя цяжкасці і з Літвой, і з Украінай. Сёння трэба думаць перш за ўсё пра тое, што ад нашага пакалення, якое цяпер жыве, у вялікай ступені залежыць, што будзе заўтра, паслязаўтра або праз 50 гадоў.

– Да таго, як вы ўзначалілі Польскі інстытут у Мінску, у вас як у рэжысёра былі праекты з беларускімі тэатрамі?

— Так. З Брэсцкім абласным тэатрам. У 90-я гады мы мелі пэўныя стасункі і з Украінай, і з Літвой. Усё маё жыццё да прыезду ў Мінск круцілася ў тэатры і вакол тэатра. І зараз як чалавеку тэатра мне шкада, што беларускія тэатры не цікавяцца польскай драматургіяй, а польскія не ведаюць беларускай.

– Таму вы пазнаёмілі віцебскага гледача са спектаклямі "Гербарый" і "Вільготнасць" (рэжысёра Л.Мондзіка) у выкананні "Пластычнай сцэны" Люблінскага каталіцкага універсітэта, а ў Любліне было ажыццёўлена выданне беларускіх п'ес С.Кавалёва?

— Так. Калі ў Польшчы з'яўляецца новая п'еса, то праз месяц яна ўжо перакладзена і вядомая ў Маскве. І тэкст даступны, і аўтарскія правы захаваныя. Калі ёсць асяроддзе, што прафесійна займаецца гэтым, і канкурэнцыя, то кожная навінка ў Еўропе пад увагай. Хто першы здабудзе, той можа мець поспех. А калі на Беларусі апошні раз ставілі Мрожка? Даўно. А гэта ж наша класіка. І нашы тэатры маглі б ставіць беларускія п'есы. Каб я зараз быў рэжысёрам у Польшчы, то паставіў бы "Стомленага д'ябла" С.Кавалёва. Але польскія рэжысёры самі выбіраюць рэпертуар і пралічваюць, ці будзе мець поспех той ці іншы твор на сцэне, бо кошт білетаў залежыць ад увагі гледачоў да спектакля. Каб быў узаемны давер, патрэбны прафесійныя кантакты. Тады не страшна і рызыкнуць. І там, дзе магчыма, гэта неабходна рабіць. У нас шмат агульнага ў гісторыі, геаграфіі, ментальнасці, культуры.

– Раскажыце, калі ласка, пра тых, хто працуе ў Польскім інстытуце.

— Некалькі асоб, якія знайшліся тут, у Мінску, людзі розных прафесій: есць тэатральны рэжысёр, філосаф, філолаг, журналістка, матэматык. Я сказаў бы як рэжысёр: сыграны калектыў. Праз некалькі гадоў сумеснай работы я бачу, што яны вераць у тое, што робяць, і робяць зацікаўлена, з душой. Спадзяюся, што я не надта цяжкі шэф для іх. Нам усім няпроста, але кожны дзень прыносіць штосьці новае, і гэта цікава. І ў тым, што мы робім, ёсць патрэба.

– Дзякую за гутарку і зычу, каб не толькі ў наведвальнікаў вашых мерапрыемстваў, але і ў вас заставалася пачуццё задавальнення і радасці.

— О не, пані! Калі чалавек задаволены, то не будзе ніякай працы. Складзі рукі і радуйся. Часам хацелася б нейкага спакою, але няма часу на адпачынак.

дыпкур'ер

ЗАЯВА

САВЕТА МІНІСТРАЎ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ДЗЯРЖАЎ САДРУЖНАСЦІ НЕЗАЛЕЖНЫХ ДЗЯРЖАЎ

Савет міністраў замежных спраў дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў разгледзеў развіццё падзей у Грузіі, якія адбыліся ўслед за парламенцкімі выбарамі 2 лістапада.

Савет міністраў замежных спраў, выказваючы сваю нязменную салідарнасць з грузінскім народам, адзначае, што змена ўлады ў Грузіі адбылася на фоне вострага процістаяння, прадаўжэнне якога магло падарваць стабільнасць не толькі ў Грузіі, але і ў рэгіёне наогул.

У гэтай сувязі дзяржавы Садружнасці лічаць прынцыпова важным зноў пацвердзіць сваю прыхільнасць вышэйшым прынцыпам дэмакратыі і вяршэнства права, якія прадвызначаюць, што ў дэмакратычнай дзяржаве змена ўлады можа адбывацца выключна канстытуцыйным шляхам, без прымянення ціску і знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў.

Нам неабыякавы лёс Грузіі, і мы выказваем надзею, што новыя грузінскія ўлады разам з усімі адказнымі сіламі грузінскага грамадства зробяць усё магчымае для вяртання палітычнага працэсу ў канстытуцыйнае рэчышча, аднаўлення нармальнага функцыяніравання дзяржаўных структур пры захаванні ў краіне грамадзянскага міру. У гэтым мы гатовы аказаць ім неабходную дапамогу і садзейнічанне.

Савет міністраў замежных спраў выказвае надзею на тое, што будучыя законна выбраныя ўлады Грузіі будуць паслядоўна праводзіць лінію на захаванне і развіццё дружалюбных адносін з дзяржавамі — удзельніцамі СНД і іншымі краінамі свету.

Дзяржавы Садружнасці выказваюць упэўненасць, што Грузія пераадолее выпрабаванні, якія выпалі на яе долю, і зойме дастойнае месца ў свеце як стабільная, дэмакратычная, тэрытарыяльна цэласная і суверэнная дзяржава.

Кіеў, 25 лістапада 2003 года.

ПОЛЬСКІЯ СУСТРЭЧЫ СЯРГЕЯ СІДОРСКАГА

У Варшаве ў рамках удзелу ў сустрэчы кіраўнікоў урадаў дзяржаў – удзельніц ЦЕІ прайшла двухбаковая сустрэча выконваючага абавязкі прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Сяргея Сідорскага з федэральным канцлерам Аўстрыі Вольфгангам Шуселем.

Кіраўнік беларускага ўрада правёў таксама сустрэчу з членамі "Усходняга клуба" Польшчы (Таварыства па падтрымцы эканамічнага супрацоўніцтва з Усходам). У сустрэчы прынялі ўдзел член клуба, памочнік Прэзідэнта Польшчы Станіслаў Цэсек, прадстаўнікі буйных польскіх прадпрыемстваў і бізнесмены.

Адбыўся абмен думкамі па праблемных пытаннях, якія аказваюць уплыў на развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Быў абмеркаваны шэраг канкрэтных сумесных інвестыцыйных праектаў. У прыватнасці, агаворана перспектыва наладжвання зборкі аўтобусаў сярэдняга класа ў Брэсцкай вобласці.

Кіраўнік урада Беларусі сустрэўся з Мітрапалітам Варшаўскім і ўсяе Польшчы Савай Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы.

С.Сідорскаму была прадастаўлена інфармацыя аб сітуацыі ў рэгіёне, дзейнасці Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, аб яе ролі ў развіцці праваслаўя ў краіне, а таксама захавання культуры нацыянальных меншасцей, у тым ліку і беларускай меншасці. С.Сідорскі выказаў удзячнасць і падзяку Мітрапаліту Варшаўскаму і ўсяе Польшчы Саве за дзейнасць царквы, накіраваную на падтрымку этнічных беларусаў Польшчы.

Прэс-служба МЗС.

асабістае

МАЕ МІНСКІЯ СЯБРЫ

Мяне завуць Ван Лю Ян. Я студэнт чацвёртага курса факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 18-га верасня 1999 года прыехаў у Мінск, а разам са мной – маладыя людзі з розных правінцый Кітая. У кожнага ёсць запаветная мара. Мы хочам ведаць еўрапейскую культуру, беларускія звычаі, любавацца прыгожай беларускай прыродай.

У кожнага з нас былі цяжкасці: мы не ведалі тутэйшых моў і, вядома, не маглі мець зносін з многімі. Я вельмі сумаваў.

Прайшлі гады, я запомніў шмат слоў і знайшоў разуменне. Але самае галоўнае — за гэты час з'явіліся беларускія сябры, якія дапамагаюць у вучобе і жыцці. Паміж намі вельмі добрыя, цёплыя адносіны. Мы разам вучымся і адпачываем.

18-га кастрычніка 2001 года я пазнаёміўся з Ірай, студэнткай хімічнага факультэта. Гэта вельмі прыгожая дзяўчына, нечым падобная на кітаянку: чорныя валасы і вочы, стройная фігура. Вельмі рады нашай дружбе. Мы разам гуляем, размаўляем, чытаем, глядзім фільмы. Я шмат расказваю пра Кітай. Вучым адзін аднаго танцаваць: я паказваю кітайскія танцы, а Іра — беларускія. Калі не разумею якое-небудзь слова, Іра ўважліва і цярпліва тлумачыць і сама хоча вывучаць кітайскую мову.

У канцы хачу сказаць: "Беларусь і мае беларускія сябры, я вас люблю!"

НА ЗДЫМКУ: кітайскія студэнты 4 курса журфака БДУ са сваімі беларускімі сябрамі.

Ван Лю Ян.

здымаецца кіно

ЯЕ КЛІЧУЦЬ КАЛІНА...

"Маё прозвішча Каліна. Гэта мая гісторыя... На самай справе я ўсё ведала. І пра Чарнобыль, і пра хваробу. Але не трэба смуткаваць. Бо гэта ўсё казка. Даўным-даўно жыла-была дзяўчынка..."

Такі фінал мяркуюць пакінуць у сваім мастацкім фільме японскія кінематаграфісты, якія апошнія паўгода жывуць паміж Токіо і Беларуссю. І спрабуюць на відэаплёнцы асэнсаваць нашу чарнобыльскую бяду.

Чаму яны звярнуліся да гэтай трагедыі, калі прайшло семнаццаць гадоў, і мы самі спрабуем яе забыць. Рэжысёр Імадзэкі лічыць, што гэта яго абавязак — яшчэ раз расказаць свету пра гісторыю Чарнобыля, а праз яе нагадаць і японцам пра Хірасіму і Нагасакі.

Сцэнарый фільма з'явіўся не адразу. Першы прыезд у Беларусь здымачнай групы прымусіў Акіру Ісікаву перарабіць амаль увесь тэкст. І толькі галоўная гераіня — васьмігадовая Алеся, якая любіць называць сябе Калінай, па-ранейшаму засталася.

Спачатку цяжка было зразумець, ці здольныя японцы адчуць Чарнобыль. Перад прыездам на Беларусь яны штудзіравалі пэўную літаратуру (і мастацкую, і навуковую), але ўсё роўна многае іх здзіўляла. Рэжысёр ніяк не мог уцяміць: пра трагедыю ведаюць усе, але чаму ў Мінску пра яе распавядаюць з пункту гледжання філасофіі. У Гомелі — насцярожана і часам гнеўна. А ў Хойніках — амаль абыякава, са словамі: "Не чапайце нас. Дапамагчы — не дапаможаце, а лішні раз успамінаць не хочацца..."

Здымачная група сустракалася з многімі людзьмі, якіх закрануў Чарнобыль.

...Дзед Іван з Тульгавічаў — старажыл беларускай зоны адсялення. У вёску ён вярнуўся праз месяц пасля эвакуацыі, і цяпер запэўніваў японцаў, што жыць тут можна і аніякай радыяцыі даўно няма. "Яе ўжо столькі гадоў таму закапалі ў зямлю. Вы ж самі адчуваеце, што яна нават і не пахне..." Дзед Іван гасцінна запрасіў кіношнікаў у хату і нават частаваў салам і смятанай. На надворку хадзілі свінні і карова. А японскі дазіметр тым часам адлічваў небяспечны радыяцыйны фон...

Потым у сцэнарыі з'явіліся сцэны, дзе дзяўчынка Алеся будзе прыязджаць да сваёй бабулі ў чарнобыльскую зону...

Аглядальная пляцоўка чарнобыльскай станцыі і адселены горад Прыпяць... Сярэдняя школа з раскіданымі па падлозе процівагазамі, нікому непатрэбнымі цяпер. І надпісы на класной дошцы — хатняе заданне на 27-е красавіка. А побач са здымачнай групай украінскі гід, які адказвае на любое пытанне і вучыць, дзе лепш ісці: "На мох не наступайце — там фон у некалькі разоў большы. Трымайцеся асфальту..."

Пасля некалькіх гадзін здымак у машыне, што едзе на Гомель, усталёўваецца напружаная цішыня. Потым высвятляецца, што японцы спрабуюць падлічыць дозу радыяцыі, якую яны маглі атрымаць. На кантрольным пункце іх супакойваюць і проста накіроўваюць у душ.

...Дзіцячы гематалагічны цэнтр у Бараўлянах. Здымачная група едзе сюды другі раз. Перакладчык спрабуе папярэдзіць, што хваробы дзяцей цяжкія, а месяц — вялікі тэрмін. Японцы, як і раней, вязуць падарункі з Токіо. І каб парадаваць маленькіх хворых, надзяваюць кімано...

Дзяўчынкі Тані, якой яны зрабілі фотаздымкі на памяць, — ужо няма...

Сцэна з фільма: "Словы гучаць на японскай мове. Гаворыць Каліна: "А яшчэ я б уратавала ўсіх, хто хварэе. Бабулю, маму, Машу і Аню. Я б хацела ўсім вярнуць усмешкі на твары. Калі б я была Богам..."

Рэжысёр Імадзэкі прызнаецца, што цяжэй за ўсё яму было пасля дзіцячай гематалогіі. Ён нават на нейкі момант падумаў, што не зможа далей здымаць гэты фільм. Таму што не ў стане перадаць і сотай долі пакут, якія выпадаюць чарнобыльскім ахвярам.

...Мінск, мікрараён Шабаны. Дом, у які праз некалькі гадоў пасля аварыі адсялілі жыхароў Хойнікаў, Брагіна, Нароўлі. Зінаіда Пятроўна прыехала з сям'ёй з Брагіна. За семнаццаць гадоў пасля катастрофы яна страціла мужа і старэйшага сына. Малодшы хворы на сэрца. Урачы кажуць — вынікі радыяцыі... Яе запаветная мара — каб Косцік паправіўся, і яшчэ адна неажыццявімая: калі-небудзь вярнуцца назад, дадому, у Брагін.

Сцэна з фільма: "Я хачу пайсці да гэтага злога чарадзея, што жыве ў рэактары. І папрасіць яго, каб больш ён не распаўсюджваў сваю атруту. Больш я яго нічога прасіць не буду – толькі гэта..." – думае Каліна.

З двухсот дзяцей з Масквы і Мінска рэжысёр Імадзэкі адабраў на галоўную ролю Алесі васьмігадовую Насцю. Яна праз пэўны час ужо добра ведала дарослых беларускіх акцёраў.

А да бабулі з фільма Таццяны Мархель пасля першага дня здымак адносілася, як да сваёй роднай. Акцёрам тэатра не прыйшлося ўваходзіць у тэму. Менавіта на іх сцэне ідзе спектакль "Чарнобыльская малітва" па кнізе Святланы Алексіевіч.

Аднак у фільме па задуме рэжысёра, акрамя акцёраў, шмат звычайных людзей, якія не іграюць ролі, а на самай справе жывуць на экране...

У канцы снежня здымкі мастацкага фільма будуць скончаны. Кінагрупа яшчэ раз наведае чарнобыльскую станцыю і накіруецца ў Токіо. Рэжысёр Імадзэкі плануе паспець зрабіць карціну да Маскоўскага міжнароднага фестывалю...

Сцэна з фільма: "Даўным-даўно жыла-была дзяўчынка Каліна". На экране буйны план — русавалосая Каліна няспешна паварочваецца да нас. Яна ўсміхаецца... Кінастужка заканчваецца.

Вітаўт ДАШУК.

афіша

ЧАРОЎНЫЯ МЕЛОДЫІ "ЗАЛАТОЙ СТРУНЫ"

Беларускую народную музыку немагчыма ўявіць без цымбалаў. Раней у вёсках было шмат умельцаў, якія выраблялі гэты інструмент, а потым і іграліна ім. Традыцыйна ў склад ансамбляў, якія іграліна ўсіх святах, уваходзілі гармонік, цымбалы і бубен. Але, цымбалы характэрныя не толькі для беларускай музыкі, гэты інструмент распаўсюджаны ў многіх краінах свету, існуе нава. Сусветны кангрэс цымбалістаў, тут добра ведаюць беларускую цымбальную школу, дзякуючы яе заснавальніку І.Жыновічу.

Апошнія дзесяць гадоў бліскуча прадстаўляе беларускія цымбальныя традыцыі ансамбль цымбалістаў Мінскага дзяржаўнага музычнага вучылішча імя Міхаіла Глінкі пад кіраўніцтвам выдатнага музыканта-выкладчыка Ганны Полесавай.

У 1996 годзе ансамбль прымаў удзел у Міжнародным конкурсе "Быдгошчскія імпрэсіі музычныя" ў Польшчы, дзе яму былі прысуджаны першае прызавое месца "Залатая струна" ў намінацыі "Інструментальныя ансамблі" і Гран-пры як лепшаму творчаму калектыву конкурсу. Гэта перамога на міжнародным конкурсе (упершыню ў гісторыі беларускай культуры) — значнае дасягненне ансамбля, і з таго часу ён носіць назву "Залатая струна". Потым было шмат канцэртаў на радзіме і за мяжой, розных узнагарод і званняў. Ансамбль паспяхова прадстаўляў Беларусь на IV, V, VI сусветных кангрэсах цымбалістаў, дарэчы, на VI, які праходзіў у Львове, ён узнагароджаны граматай, як лепшы прафесійны калектыў кангрэса.

У саставе ансамбля звычайна 7-11 музыкантаў. Тэмбравая палітра аднародная, бо складаецца ў асноўным з цымбалаў-прыма. А багатага гучання ансамбль дасягае за кошт майстэрства выканаўцаў. Ансамбль "Залатая струна" многія музыказнаўцы называюць ансамблем салістаў, такі высокі выканаўчы ўзровень яго ўдзельнікаў. Кожны і сапраўды можа быць салістам, бо віртуозна валодае інструментам. Так, Дар'я Азончык і Таццяна Сушчэня — лаўрэаты міжнароднага конкурсу, Крысціна Труляева — дыпламант міжнароднага конкурсу, Вольга Клімовіч — лаўрэат міжнароднага і рэспубліканскага конкурсаў. Яркія выканаўцы Настасся Абмётка, Алена Пякарская, Людміла Меланіч, Марына Калечыц і Ганна Марчадзе скончылі музычнае вучылішча, некалькі гадоў таму, але працягваюць іграць у любімым ансамблі.

Душа калектыву — яго кіраўнік Ганна Полесава. Калі ў жніўні 1997 года калектыў выступаў на Сусветнай аркестрадзе ў горадзе Брыў у Францыі, прэзідэнт FNAPEC (нацыянальнай федэрацыі асацыяцый бацькоў, выкладчыкаў музычных школ і кансерваторый Францыі) Сімона дзю Брэй, паслухаўшы некалькі выступленняў ансамбля, напісала: "Які б ні быў рэпертуар, іх мастацкі кіраўнік Ганна Полесава ўмее давесці яго да дасканаласці. Мы захапляемся музычнымі якасцямі гэтай групы. Брава!"

Калі згадваеш увесь рэпертуар ансамбля, здзіўляешся яго багатай тэматыцы: тут і англійскі мадрыгал XVI стагоддзя, і духоўныя інструментальныя песнапенні, і творы многіх беларускіх кампазітараў: І.Жыновіча, І.Лучанка, Д.Смольскага, Л.Захлеўнага і многіх іншых.

Зусім нядаўна, у кастрычніку 2003 года, на II Міжнародным конкурсе выканаўцаў на шматструнных інструментах у Пскове журы высока ацаніла творчую работу Ганны Полесавай, узнагародзіўшы яе Дыпломам за творчыя дасягненні ў падрыхтоўцы ўдзельнікаў конкурсу, а сам ансамль стаў уладальнікам Гран-пры і звання лаўрэата.

Выступалі артысты ў прыгожых касцюмах, мадэлі якіх распрацавала вядомы мастак-дызайнер Айша Александровіч.

Выканальніцкае майстэрства цымбалістаў не было б такім зладжаным, каб не вопытныя канцэртмайстры-піяністы: лаўрэат міжнароднага і рэспубліканскага конкурсаў Марыя Пракоп'ева, Галіна Дзерышава, дыпламант рэспубліканскага конкурсу Ганна Гарупа, дыпламант міжнародных конкурсаў Аляксей Сідараў. Усе яны добра адчуваюць гучанне цымбал, ведаюць тэхнічныя і мастацкія здольнасці выканаўцаў.

Псіхолагі гавораць пра дабратворны ўплыў прыгожай музыкі на паводзіны і культуру людзей. Упэўнена, што музыка, якая гучыць у выкананні ансамбля "Залатая струна", робіць нас добрымі, духоўнымі, адкрытымі, інакш і быць не можа, бо ўсе выканаўцы бескарысліва і шчыра адданы служэнню мастацтву.

НА ЗДЫМКУ: ансамбль "Залатая струна", кіраўнік Ганна ПОЛЕСАВА (у першым радзе ў цэнтры) і канцэртмайстар Ганна ГАРУПА (злева).

Ганна КАЛЯДКА.

спадчына

НОВЫ ВЕК МІНСКАЙ РАТУШЫ

На плошчы Свабоды ў Мінску ўзнялася адбудаваная ратуша. Падзея цікавая ўжо тым, што гісторыя яе пабудовы пачыналася яшчэ ў XV стагоддзі.

14 сакавіка 1499 года вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Аляксандр дае Мінску магдэбургскае права — права на самакіраванне. Ад намесніка вялікага князя, які да гэтага правіў горадам, улада перайшла да магістрата, што складаўся з дванаццаці дарадцаў, іх выбіралі гараджане, і войты, прызнанага вялікім князем. Магістрату, натуральна, патрэбна было памяшканне і не абы якое, а прадстаўнічае. Першапачаткова, можна меркаваць, гэта быў драўляны будынак, але ж ужо ў канцы XVI стагоддзя на плошчы, якая з цягам часу стане Саборнай, з'явілася мураваная ратуша. У студзені 1591 года яе вежу ўпрыгожвае герб горада з выявай Божай Маці Панны Марыі.

Ішлі гады, мяняліся стагоддзі, а ратуша заставалася сімвалам горада. Але ў канцы XVIII стагоддзя, калі Мінск трапіў пад уладу расійскай кароны, горад страціў самакіраванне і ратуша пачала паступова прыходзіць у заняпад. У яе будынку ў 1844 годзе пачаў працаваць тэатр, але час рабіў сваю справу, і ў 1851 годзе па распараджэнні губернатара Ф.Шклярэвіча ратуша была знесена.

Пра яе аднаўленне загаварылі ў 80-я гады мінулага стагоддзя, калі ў Мінскіх рэстаўрацыйных майстэрнях быў распрацаваны праект. Але, відаць, час быў не той для яго рэалізацыі.

Незалежнасць Беларусі расставіла свае акцэнты і ў гістарычнай справе. Мінск вярнуў сваю былую значнасць не толькі як сталіца незалежнай дзяржавы, але і як самастойная адміністрацыйная адзінка. І ўзняўся з нябыту будынак ратушы, якую ўпрыгожвае стары герб горада, а яе гадзіннік адлічвае новы час у гісторыі горада.

НА ЗДЫМКУ: адбудаваная ратуша.

Тэкст і фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

440 ГАДОЎ ВІЦЕБСКАЙ ЕПАРХІІ

З нагоды 440-годдзя Віцебскай епархіі адбылася Боская літургія ў Свята-Пакроўскім кафедральным саборы. Яе правёў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Затым мітрапаліт Філарэт узначаліў хрэсны ход ад храма да Свята-Успенскага сабора, дзе адбыўся малебен.

У рамках свайго знаходжання ў Віцебску мітрапаліт Філарэт наведаў таксама Маркаў мужчынскі манастыр і Успенскую царкву.

У гэты ж дзень у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа адбыўся ўрачысты вечар з удзелам праваслаўнай і свецкай грамадскасці. Служыцелям Віцебскай епархіі ўручаны прывітальныя адрасы ад Віцебскага аблвыканкама і аблсавета, гарвыканкама і гарсавета, каштоўныя падарункі ад шматлікіх гасцей з суседніх епархій, працоўных калектываў і ўстаноў. Майстры мастацтва і самадзейныя артысты горада падрыхтавалі для ўдзельнікаў урачыстасцей вялікі святочны канцэрт.

Старшыня Віцебскага аблснога савета па справах рэлігій і нацыянальнасцей Мікалай Сцепаненка паведаміў, што першае летапіснае ўпамінанне пра Віцебскую епархію датуецца 1563 годам. За сваю гісторыю аб'екты духоўнай культуры разбураліся ў час войнаў, а ў 1936 годзе былі зачынены 16 з 17 храмаў, узарваны Свята-Успенскі кафедральны сабор. У апошнія 10 гадоў, па словах Мікалая Сцепаненкі, у вобласці пры падтрымцы мясцовых улад ідзе актыўнае аднаўленне ўстаноў Віцебскай епархіі.

Зараз у яе саставе 15 благачынняў, 68 дзеючых храмаў, 5 брацтваў, 4 манастыры, 24 прыходскія сястрынствы. Пачалі дзейнічаць Віцебскае праваслаўнае духоўнае вучылішча, выдавецкі аддзел. Толькі ў 2001–2003 гадах на аднаўленне аб'ектаў епархіі унітарнае прадпрыемства "Віцебскі цэнтр рэстаўрацыі" выдаткавала 1,4 мільярда рублёў. Пачалося будаўніцтва Свята-Успенскага сабора, якому будзе вернуты статус кафедральнага. Камень на месцы закладкі храма, які абяцае стаць архітэктурнай дамінантай горада, асвяціў у верасні 1998 года Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II.

Галіна ВІР.

КОРАТКА

КРЫЖУ ЧАТЫРЫ СТАГОДДЗІ

У адным са старажытных раёнаў Мінска – вуліцы Няміга – удача напаткала сталічных археолагаў.

Здымаючы крупінку за крупінкай культурны пласт XVII стагоддзя, яны адшукалі унікальны складны крыж-машчавік. Насілі носяць іх толькі свяшчэннікі.

Кіраўнік раскопак гісторык Сяргей Тарасаў мяркуе, што адзін з іх і згубіў чатыры стагоддзі таму гэту частку сваёй прафесійнай атрыбутыкі. Крыж знайшлі на месцы хлява сядзібы позняга сярэдневякоўя. Хутчэй за ўсё, знаходка належала свяшчэннаслужыцелю аднаго з мінскіх храмаў. Займаючыся гаспадаркай, ён згубіў крыж у саломе, сляды якой тут захаваліся.

БАГАСЛОЎСКАЯ ЛІТАРАТУРА ДАСТУПНАЯ ЎСІМ

У Епархіяльнай бібліятэцы Беларускай праваслаўнай царквы больш за 2 тысячы чытачоў.

Каля 22 тысяч кніг і брашур захоўваецца ў фондах гэтага збору літаратуры, якая ўсім жадаючым адкрывае вышэйшыя ісціны Свяшчэннага Пісання, царкоўныя таінствы, сэнс богаслужэнняў.

У чытальных залах бібліятэкі можна таксама набыць неабходныя веды і для навуковай працы, і для пашырэння ўласнага кругагляду.

"Мінск-Навіны".

ХРАМЫ БЕЛАРУСІ

ДЗЯТЛАЎСКІ КАСЦЁЛ

Як сведчыць гісторыя, у 1624 годзе ў Дзятлаве пачалося будаўніцтва мураванага касцёла. На гэтую важную справу выдаткаваў сродкі Казімір Леў Сапега, адзін з самых дасведчаных людзей свайго часу. Гэты чалавек быў багатым і ўладным – з 1637 года выконваў абавязкі маршалка літоўскага, а з 1647-га быў падканцлерам літоўскім.

На яго рахунку шмат добрых спраў: на ўласныя сродкі заснаваў юрыдычны факультэт у Віленскай акадэміі, падараваў яму сваю Ружанскую бібліятэку, у якой налічвалася тры тысячы тамоў.

Варта адзначыць, што Казімір быў сынам вядомага Льва Сапегі, канцлера Вялікага княства Літоўскага і ўкладальніка яго статута. Словам, сын працягваў справу бацькі і клапаціўся пра юрыдычную аснову дзяржавы і прававую культуру народа.

Будаўніцтва дзятлаўскага касцёла працягвалася 22 гады. У 1646 годзе храм у стылі віленскага барока паўстаў перад людзьмі ва ўсёй сваёй велічы і красе. Гэта быў сапраўдны помнік архітэктуры XVII стагоддзя.

Пры непасрэдным удзеле Казіміра Сапегі ў касцёле пачаўся збор багатай бібліятэкі. Праўда, яна згарэла ў час пажараў у XVIII стагоддзі.

У 1751 годзе пасля вялікага пажару касцёл быў перабудаваны ў барочна-ракайльным стылі. Гэтай справай, у асноўным, займаўся дойлід А.Асікевіч па фундацыі М.Радзівіла.

Восенню 1882 года зноў згарэў дах храма. А ў 1900-м яго аднавілі на сродкі парафіян.

Радуе людзей касцёл Успення Багародзіцы і сёння. Будынак храма прызнаны выдатным дасягненнем архітэктуры.

Няўмольна бяжыць час. Храму ўжо за 355 гадоў. Ён быў "сведкам" Паўночнай вайны, у час якой шведы спалілі самую старажытную пабудову мястэчка — драўляную крэпасць, зробленую яшчэ князем Астрожскім. Паўз сцены касцёла прайшлі нашэсце Напалеона 1812 года, першая і другая сусветныя войны...

І даўней, і сёння ідуць у храм мясцовыя вернікі, сярод якіх ветэраны вайны і працы, інваліды, нясуць сюды сваё гора і радасці, спадзяванні, адкрываюць перад Богам свае сэрцы, знаходзяць душэўны спакой. Тут вянчаюцца маладыя пары, нараджаюцца новыя сем'і.

Жыхарам райцэнтра і навакольных вёсак дасталася вялікая духоўная спадчына. Абавязак, справа гонару кожнага — берагчы і захоўваць яе, каб гэты храм яшчэ доўга-доўга служыў людзям і быў у радасць нашчадкам.

Іосіф ЗАЯЦ.

НА ЗДЫМКУ: касцёл у Дзятлаве.

На "Пакроўскім кірмашы", які нядаўна адбыўся, пазнаёмілася з работамі праваслаўнага мастака, іканапісца Свята-Васкрасенскага прыхода Анатоля Кузняцова. Яго пейзажы напоўнены цяплом, вяртаюць у добры свет успамінаў: "Зусім прастуджаны кот", "Восень", "Бацькоўскі дом"... Асабліва ўразіў "Партрэт бацькі". Доўга глядзела на карціну і хацела зразумець, што так моцна прыцягвае да яе? Магчыма, сама асоба чалавека, што на партрэце, яго моцны характар. Мастак здолеў перадаць не толькі знешняе падабенства, а і сутнасць чалавека.

"ДЗЯКУЙ ЗА СВЯТА ДУШЫ..."

Бацька Анатоля пасля вайны выкладаў маляванне, і ў сына любоў да маляванне пачынаецца з дзяцінства. А яшчэ бацька прывучаў да працы, наказваў: "Любі працу і прыгажосць прыроды", да якой сам адносіўся з замілаваннем. Успамінае, як радаваўся бацька, калі яны хадзілі з ім у лес, як шмат цікавага расказваў пра дрэвы, пра звяроў.

У 15 гадоў Анатоль пакінуў сваю родную Адоеўшчыну, што на Паволжы, і паехаў вучыцца ў тэхнікум у Сызрань, а потым, пасля службы ў арміі, застаўся ў Беларусі.

Тут А.Кузняцоў сустрэўся з рэстаўратарамі вышэйшай катэгорыі Уладзімірам Праўдзюком і Пятром Журбеем, якім дапамагаў у працы. З вялікім разуменнем аднесліся яны да яго захаплення маляваннем. Пад іх кіраўніцтвам ён пісаў свае карціны. Працаваў аддана. І гады напружанай працы далі свае вынікі. Хутка карціны пачалі дэманстравацца на выставах.

У кожнага чалавека свой шлях да ісціны, да Веры, да Бога. Паўсядзённыя размовы з Пятром Журбеем на рэлігійныя тэмы і Святы Боскі дух старажытных ікон прывялі да хрышчэння, якое ён прыняў у 1995 годзе ў Петрапаўлаўскім саборы ў Мінску.

А ў чэрвені 1998 года Анатоль убачыў сон, у якім святы старац блаславляе яго на напісанне ікон. І што цікава: сваю першую ікону "Святы мучанік Анатоль" ён пачаў пісаць, як стала вядома потым, менавіта ў ноч смерці блізкага яму чалавека, мастака і настаўніка Уладзіміра Праўдзюка. Як расказаў Анатоль, цяга да напісання ікон не была выпадковай, з юнацкіх гадоў яго цікавіла мінулае — калекцыяніраваў старыя манеты і іконы, захапляўся археалогіяй.

Мастак стварыў шмат ікон. Як сам кажа, у момант творчага азарэння ён здольны спаць па 2–3 гадзіны ў суткі і не есці. Усе яго думкі, пачуцці накіраваны на дасягненне нейкай вышэйшай маральнай мэты. Адна з самых яго любімых работ "Годна ёсць". Дарэчы, так называлася і адна з яго шматлікіх выстаў. Захаваліся запісы водгукаў наведвальнікаў з той выставы, прывяду адну з іх, найболей характэрную: "Дзякуй за свята душы! Мастак здолеў сваім майстэрствам закрануць душу. Дабрыня карцін выклікае станоўчую энергію — гэта калі хочацца жыць і рабіць толькі добрае" (Несцяровіч). Такія словы натхняюць мастака на тварэнне.

Таццяна КУВАРЫНА.

НА ЗДЫМКАХ: мастак Анатоль КУЗНЯЦОЎ; работы мастака — "Партрэт бацькі" і ікона "Годна ёсць".

ФОТАФАКТ

НОВЫЯ ТРАДЫЦЫІ

Усё часцей на адкрыццё новых грамадзянскіх ці ваенных аб'ектаў запрашаюць свяшчэннаслужыцеляў. Вось і нядаўна асвяцілі новую пагранічную камендатуру ў пункце пропуску "Гудагай" Смаргонскага пагранатрада.

НА ЗДЫМКУ: у час асвячэння новай пагранічнай камендатуры.

Фота **Віктара ТАЛОЧКІ**, БелТА.

сустрэчы

ШЛЯХІ ПРЫВЯЛІ НА РАДЗІМУ

З ГЕРМАНІІ...

10—20 лістапада ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі праходзіў I Міжнародны конкурс інструменталістаў імя Міхала Ельскага. У склад яго журы ўваходзіла Аліна Кудзялевіч-Мюлер з Германіі, наша суайчынніца.

– Якім жа чынам лёс закінуў вас, спадарыня Аліна, у Германію?

— Спачатку лёс "закінуў" мяне ў Маскву. У 1985 годзе я паступіла ў Маскоўскую кансерваторыю імя П. Чайкоўскага ў клас прафесара Міхаіла Хаміцэра і Марыны Чайкоўскай, які скончыла з адзнакай. Была накіравана ў аспірантуру. У жніўні 1990 года атрымала запрашэнне на Міжнародны фестываль маладых музыкантаў у Вайкерсхайм (Германія). Там была заўважана рэктарам Вышэйшай школы з Карлсруэ. Ад яе паступіла прапанова стажыравацца ў Германіі.

– І якія ж магчымасці адкрыліся перад вамі ў павышэнні майстэрства, канцэртнай дзейнасці?

— З'явіліся ўмовы для эфектыўнай працы, велізарныя магчымасці падрыхтоўкі і ўдзелу ў розных міжнародных конкурсах. Прайшла стажыроўкі ў Берлінскім радыёсімфанічным аркестры, Цюрынгскай філармоніі, Радыёаркестры Саарбрукена. Выступала на тэлебачанні, запісвалася на радыё ў Швейцарыі і Германіі. Прафесійна замацоўвала майстэрства на сцэне ў вядомых калектывах Германіі: як першая салістка камернага аркестра ў Нойсе, салістка Нямецкай камернай філармоніі ў Брэмене, першы канцэртмайстар па віяланчэлі Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра зямлі Рэйнланд–Пфальц.

– А ў конкурсах вы прымалі ўдзел?

— У 1992 годзе на Міжнародным конкурсе ў Швейцарыі атрымала "Прыз Балуа" (другая прэмія). Тады ж прыняла ўдзел у Міжнародным конкурсе "Беларуская музычная восень" (чацвёртая прэмія і званне лаўрэата). У 1993 годзе — I прэмія Міжнароднага конкурсу імя В. Гізінім у Саарбрукене (Германія). Асабліва плённым быў 1994 год: другая прэмія Конкурсу камерных ансамбляў у Бельгіі, спецыяльны прыз конкурсу камерных ансамбляў у Трапані (Італія), фіналістка

Міжнароднага конкурсу ARD у Мюнхене.

– Некалькі слоў пра вашу сям'ю: мужа, дзяцей.

— Муж таксама музыкант — скрыпач, альтыст. Гадуем дваіх дзетак.

Зараз мы трэці паверх свайго дома афармляем пад музычны салон, дзе плануем праводзіць музычныя вечарыны, прапагандаваць беларускую музыку. Я атрымала якраз некалькі п'ес Галіны Гарэлавай. Будзем іграць творы і іншых беларускіх кампазітараў.

– А ці сустракалі вы ў Германіі беларусаў?

— На жаль, не.

– У завяршэнне, раскажыце, калі ласка, пра вашы планы.

— Пры музычнай школе ў Гінгене летась створаны Фонд імя Герміны Кленц дзеля падтрымкі таленавітай моладзі. Стала яго дацэнтам. Сёлета ж мяне запрасілі яшчэ на пасаду дацэнта Летняй акадэміі музыкі для моладзі ў Марытабердорфе. Буду прымаць удзел у конкурсах, праводзіць музычныя вечары. І прыязджаць на радзіму.

– Дзякуй за размову, і – поспехаў вам.

...І З РАСІІ

18 лістапада ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску адкрылася персанальная выстава пецярбургскага мастака Дзмітрыя Якуцені. Родам ён з Беларусі.

– Спадар Зміцер, гэта першая ваша выстава ў Мінску?

— Так, але не першая ў Беларусі. У 1999 годзе адбылася выстава маіх твораў у Брэсцкім краязнаўчым музеі. Тады ж — у Пружанах.

– А дзе яшчэ выстаўляліся вашы творы?

— У 1989 годзе — у Літаратурным музеі Ганны Ахматавай, у 1990-м — у Палацы культуры імя Газы, у 1996-м — у Вялікім палацы ў Стрэльні, у 1997-м — Блакітная гасціная Саюза мастакоў. Усё гэта цяперашні Санкт-Пецярбург. Затым былі Таганрог і Кіславодск, зноў прэстыжныя залы Санкт-Пецярбурга. Сёлета — Царскае Сяло, музей-ліцэй А. Пушкіна.

– Якія традыцыі вы развіваеце ў сваёй творчасці, майстэрства якіх жывапісцаў вас прываблівае?

— Захапілі традыцыі рэалістычнай школы жывапісу перасоўнікаў. Асабліва вабіць Бялыніцкі-Біруля. Хацелася б пабываць у музеях Магілёва і Бялыніч, пазнаёміцца з іх экспазіцыямі.

– Калі ж вы пакінулі Беларусь?

— Выехаў у 1963 годзе, а з 1971-га жыву і працую ў Ленінградзе, цяперашнім Санкт-Пецярбургу. Ёсць свая майстэрня на Фантанцы, творчая дача ў Стрэльні, на беразе Фінскага заліва. Маё творчае крэда: свабоду дае толькі натура.

– Якія планы на будучыню?

— Хацелася б намаляваць знакамітыя беларускія мясціны, гістарычныя сядзібы, помнікі архітэк-

туры. Але адначасова вельмі вабіць і Волга.

– Ці сустракаецеся вы з прадстаўнікамі беларускай дыяспары, якія жывуць у Санкт-Пецярбургу?

— Знаёмы з мастаком Сямёнавым-Ляпуновым. Ён не толькі мастак, але і матэматык. Яшчэ — з доктарам біялагічных навук цёзкам па прозвішчу Якуценем. Але хацелася б наладзіць сувязі з суполкай беларусаў, якія жывуць і працуюць у Санкт-Пецярбургу.

– Колькі працягнецца выстава ў Мінску?

— Да канца снежня гэтага года.

– Дзякую за гутарку. Будзем чакаць вашых новых твораў.

Гутарыла **Валянціна ГРЫШКЕВІЧ.**

зваротная сувязь. зша

Атрымаў некалькі нумароў штотыднёвай газеты "Голас Радзімы". Для мяне гэта прыемная неспадзяванка. Прызнаюся, прачытаў іх, як кажуць, "ад вокладкі да вокладкі". Са старонак газеты дыхнула родным беларускім водарам. Здаецца, нібы глынуў свежы струмень жыватворнага паветра.

З такой жа асалодай нумары газеты чыталі і перачытвалі блізкія і знаёмыя мне людзі, карані якіх моцна трымае беларуская зямля. Дзякуй вам ад усяго сэрца за такую шчодрую ўвагу.

Жадаю вам плёну ў той вялікай справе, якую вы выконваеце выданнем сваёй газеты, вельмі патрэбнай ва ўсіх куточках зямнога шара, куды закінуў лёс выхадцаў з незабыўнай і прывабнай беларускай зямлі. Добрага здароўя і невычэрпнай творчай энергіі ўсім супрацоўнікам газеты, якая падтрымлівае сувязі людзей з іх родным кутком.

З падзякай за ўвагу і найлепшымі пажаданнямі

Цімафей ЛЕАКУМОВІЧ, прафесар.

госць

Лілія ЦВЯТКОВА:

"МАЯ ДУША АКУНУЛАСЯ Ў БЕЛАРУСЬ І ПАМАЛАДЗЕЛА"...

Лілія Цвяткова – кіраўнік нацыянальна-культурнага аб'яднання грамадзян "Беларусь" у Белгарад-Днястроўскім, што пад Адэсай. Пра дзейнасць гэтай беларускай арганізацыі ва Украіне наша газета неаднойчы пісала. На гэты раз Лілія Цвяткова прыехала на радзіму, каб трапіць на Каласавіны. Знаёмства з музеем завязалася ў час свята газеты "Голас Радзімы", якое праходзіла ў Адэсе і Белгарад-Днястроўскім. У хуткім часе Лілія Цвяткова наведала Мінск, і тады было заключана пагадненне аб узаемным супрацоўніцтве паміж суполкамі ў Адэсе і Белгарад-Днястроўскім і музеем Якуба Коласа. Спачатку "Каласавіны" праходзілі ў Мінску. Потым іх удзельнікі паехалі па каласаўскіх мясцінах – наведалі Альбуць, Акінчыцы, Смольню. Лілія Цвяткова вельмі ганарыцца знаёмствам з сынам Якуба Коласа, яго ўнукамі. "Мая душа за гэтыя дні акунулася ў Беларусь і памаладзела на гадоў 20", – кажа яна. Цікавым было адкрыццё карчмы "Альбуць" на трасе Мінск – Брэст. Дарэчы, там Лілія Цвяткова чытала Коласа на ўкраінскай мове. З сабой на Украіну Лілія Анатольеўна павезла не толькі ўспаміны, але і фільм, які знялі для яе ў гэтыя дні.

Л.Цвяткова расказвае:

— Трэба пажыць нейкі час далёка ад радзімы, каб уявіць, наколькі для людзей важная і дарагая кожная вестка з Беларусі. Я добра разумею, чаму людзі будуць прыходзіць да нас у суполку і пытацца ў мяне, як з'ездзіла, што бачыла. А на гэты раз змагу паказаць ім не толькі фатаграфіі, але і відэастужку. Многія ж на працягу дзесяцігоддзяў не былі на Беларусі. І для іх сапраўдная падзея — даведацца пра яе амаль увачавідкі.

Як я заўважыла, "Каласавіны" ў многім рабіліся на энтузіязме і грамадскіх пачатках. У нас таксама шмат чаго адбываецца менавіта такім чынам. Тая ж бібліятэка, якую мы сабралі з асабістых кнігазбораў. Цяпер людзі з задавальненнем звяртаюцца да нас па беларускія кнігі. Асабліва каштоўнымі дазваляем карыстацца толькі на месцы.

– Што новага адбылося апошнім часам у вашай суполцы?

— У верасні святкаваліся Дні Белгарад-Днястроўскага, дзе мы прадстаўлялі беларускую дыяспару. У павільёне, які нам выдзелілі, размясцілі беларускія кнігі, дзяржаўныя сімвалы, сувеніры, дыскі, касеты з беларускай музыкай. Расказвалі пра Беларусь.

Цяпер пра нас у горадзе дакладна ведаюць. Як высветлілася, многія вядомыя людзі звязаны з Беларуссю. Напрыклад, галоўны рэдактар нашай раённай газеты "Савецкае Прыднястроўе" Наталля Кечына родам з Віцебска. А сярод бліжэйшых планаў адкрыццё будучым летам у Адэсе беларускай кавярні. Магчыма, з цягам часу там будзе беларускі клуб. У нас шмат энтузіястаў. Толькі намаганнямі такіх людзей нешта і адбываецца, бо яны разумеюць каштоўнасць сваёй нацыянальнай культуры.

Айцец Нестар, які нарадзіўся ў Брэсце, а цяпер служыць у Барысаўскім манастыры недалёка ад Белгарад-Днястроўскага, прачытаўшы ў "Голасе Радзімы" інфармацыю пра дзейнасць нашай суполкі, выказаў вам вялікую ўдзячнасць і назваў нашу з вамі працу богаўгоднай справай. І мне прыемна, што я маю да гэтага нейкае дачыненне.

Гутарыла **Алена СПАСЮК.**

асоба

МАЛАДЗЕЧАНСКІ ЖАК ІЎ КУСТО

Заўжды з асаблівай нецярплівасцю чакаю лістоў з Калінінграда, з "Музея сусветнага акіяна". Ведаю: нешта ізноў дагэтуль невядомае раскажуць музейшчыкі пра Арцемія Іванова – маладзечанца, вядомага свету вучонага. Легенда савецкай і мо нават сусветнай навукі! Нястомны даследчык жывёльнага свету акіяна. Сапраўдны Жак Іў Кусто. А нарадзіўся Іваноў у Маладзечне ў 1906 годзе.

Вядома, што бацька працаваў доктарам. Закончыў Арцемій біялагічнае аддзяленне Ленінградскага універсітэта. Студэнцкую практыку праходзіў на Мурманскай біялагічнай станцыі. Ужо тады вызначыўся цікаўнасцю да беспазванковых, якія жывуць на марскім ці акіянскім дне. Працаваў на шхуне "Мікалай Кніповіч". У 1930 годзе наш зямляк едзе пад Уладзівасток. Займаецца навукай на Ціхаакіянскай навукова-прамысловай станцыі. Удзельнічае ў экспедыцыях у Ахоцкае, Берынгава і Чукоцкае моры.

Пасля Арцемій Іваноў вяртаецца на работу ў Заалагічны інстытут Акадэміі навук СССР. Свае папярэднія росшукі, матэрыялы экспедыцыі абагульняе ў "Атласе анатоміі прамысловых беспазванковых далёкаўсходніх мораў" (выдадзены ў 1949 годзе). І зараз гэтым унікальным даведнікам карыстаюцца як вучоныя-біёлагі, так і прамысловыя здабытчыкі акіянічных багаццяў.

Да меркаванняў, навуковых высноў маладога вучонага прыслухоўваюцца. У галіне эвалюцыі беспазванковых дасведчанасць Арцемія Іванова набывае ўсё большы аўтарытэт. З асаблівай ахвотай наш зямляк удзельнічаў у экспедыцыях акіянаграфічнага судна "Віцязь" (цяпер яно знайшло вечны прытулак у "Музеі сусветнага акіяна" ў Калінінградзе). Пяць разоў хадзіў у паходы з "Віцязем". І штораз навуковы багаж вучонага павялічваўся. Светапогляд, мышленне багацелі, станавіліся істотна шырэйшымі. Вядома, спрыялі гэтаму папярэдні вопыт, здольнасць ісці наперад, не спыняцца, але — і сам "Віцязь", умовы працы на навукова-даследчым судне таксама. Не выпадкова ж высокую ацэнку магчымасцям "Віцязя" далі і яго ганаровыя наведвальнікі — Ісак Іў Кусто і Тур Хеердал.

Арцемію Іванову належыць адкрыццё жывёл-паганафораў. Да Іванова ніхто ў навуцы нават не здагадваўся пра іх існаванне. Хто ж гэта такія — загадкавыя паганафоры? Асноўныя наведвальнікі, жыхары глыбінных гідратэрмаў. У трубках з хітыну і бялку. Наверх высунуты толькі жабры, якія нагадваюць бараду. Адсюль і назва: "Паганафоры — тыя, якія носяць бараду..."

У 1960 годзе была выдадзена манаграфія А.Іванова "Паганафоры". У 1961-м Арцемія Васільевіча ўшанавалі званнем лаўрэата Ленінскай прэміі. Усяго 19 радкоў адведзена вучонаму-земляку ў "Беларускай Энцыклапедыі". На тое яна і энцыклапедыя, каб быць лаканічнай. Але так хочацца, каб як мага шырэй ведалі ў Беларусі пра навуковы, жыццёвы лёс суродзіча... Яшчэ ў 1959 годзе Іванова прынялі ў правадзейныя члены Германскай акадэміі прыродазнаўчых навук. У 1981 годзе Арцемія Іванова абралі акадэмікам Акадэміі навук СССР. Здабыткі вучонага адзначаны Залатым медалём імя І.І.Мечнікава.

Даследчык маштабу Арцемія Іванова — унікальная фігура ў галіне прыродазнаўчых навук увогуле. І чаму, напрыклад, не заснаваць беларускай акадэмічнай навуцы прэмію альбо ганаровы медаль у знак памяці вучонага-земляка? Ці мо прэмія імя Іванова будзе заснавана ў Маладзечне — для заахвочвання юных навукоўцаў?

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

Валянціна АКОЛАВА

АРШАНСКІ ПРАРОК КАРАТКЕВІЧ

Беларускі вянок санетаў

1

Стагоддзя апошнюю восень святкуюць Пакровы.
Пагляд Караткевіча зоры ўзвышае сабой,
Славянскай гісторыі Памяць вартуе скрозь боль
Пад звонкія гуслі прамоленай матчынай Мовы.

Пачуй, Беларусь, заклінальныя воклічы-словы:
— Ёсць штормы ў Духоўнасці! Дзей незваротных прыбой!
Ёсць таленты ў мужнасць і ў роўню, Натхненне, з табой!
Імёны іх — святасць! З партрэтаў іх — княжыя бровы.

Іх думкі — пасланні. Замовы. Прароцтвы на Заўтра!
Іх постаці — Богу насустрач... сучаснік, ці ж варта:
Славутых не славіць? На чырвеннасць руж глядзець?

Радзіму давучваць не колкія смешачкі з жартаў...
Класічныя прозвішчы ў зорных пазначаны картах, —
Паэтаў Жыццё — апярэджвае Час. Нішчыць смерць.

Паэтаў Жыццё — апярэджвае Час. Нішчыць смерць.
Былінныя сцежы для мудрасці — не перашкодай.
Адвеку — мастак на ўслужэнні Айчыны. З народам, —
Наўслед Караткевічу — доўга яшчэ нам глядзець!

Збароньваць ад немасці край беларускі. Сталець —
Ад слоў пракаветных... Слугуе як? Вёснам прырода:
Здзіўляцца. Маліцца на жытняе зерніва ўсходаў.
Кахаць і любіць. Дараваць. І духоўна святлець.

Натхненне з нажывай — радок не спалучыць ніколі.
Адзенне рамантыкаў — з песень саткана і з волі, —
Што ярка ўзгарэла, не вернецца — попелам тлець...

— Хто — з міласцю сэрцаў і ў поплеч анёльскай спатолі?
— Хто — мужнасці князь? — запытайце ў аршанскае долі, —
На поўныя грудзі дыханне ў прарокаў. Не ледзь.

3

На поўныя грудзі дыханне ў прарокаў. Не ледзь...
— Згадаць, Уладзімір Сямёнавіч. Творчай суполцы:
Як Вы бараніліся ад цемрашалых пры сонцы —
Мастацтвам. Няславу цярпелі... Ад Вас нам — мудрэць.

Імкнуцца да святасці. Горыч-бяду — адалець:
Як квецень — чарноцце, пры яркай чаромхавай гронцы,
Калі ўсцяж вясновасць зялёная ў роснай скарбонцы,
І клён маладзёны не знае пра восені медзь;

І кожны з вякоў маці-Вечнасці сын найгеройскі,
Пра воблік пісьменніка — важкі, сумленны і дзёрзкі.
Гісторыю пішуць праўдзівыя аўтары Мовы;

Ваш — з подзвігу: лёс! Пра яго на ўвесь свет адгалоскі.
О век XXI! Які ж ты? Камп'ютэрны? Боскі? —
Званамі звіняць Караткевіча ў Заўтрае словы!

4

Званамі звіняць Караткевіча ў Заўтрае словы:
— Славянская еднасць: як — хлеб, соль, паветра і зрок,
Як першы дзіцячы, адораны радасцю, крок,
Як вырай буслоў над зямлёй: белакрыла-вясновы...

Прыходзь, Беларусь, да дзяржаўнае думкі, — высновы:
"Натхненне і мужнасць — братоўцы да скону. Урок
Радзімы ў Аршанца славутага — веры зарок:
Мастацкая кладка з класічнасці ў сцежань — век новы".

Прывець, год Двухтысячна першы, вяртанне Паэт,
Гісторыі сына! (Вянок мой санетаў пра гэта!)
Ён кліч — Адраджэння. Ён — прозвішчаў найзалатовых.

Згадай, вечар Зораў, плач мінскага ліўня ў дзень лета,
Калі роднай Музы ўладар парадніўся з сусветам,
Настаўнікаў нацыі — лёс (да радка!) мазалёвы!

5

Настаўнікаў нацыі — лёс (да радка!) мазалёвы.
Ці ж цынікам зведаць — нябёсныя клятвы пісьмён:
З ахвярным служэннем радзіме цяпер (як здавён).
(Хваробы — дачасна ссякаюць адважных галовы!)

Гісторыю славіць — не лес распілоўваць на дровы.
Імёны Вялікіх — з вясёлкавых фарбаў-прамён!
І ў ночаньку з ценістай цемрай для ўсіх Караткевіч відзён.
Пісьменнікам быць — не занятак гульнёва-піровы!

Не знаюць супынку дарожыны светлай душы...
Адвечар XX веку! Ты ў гневе цішы.
Твой плач — пакаяннем. Свячынам (да неба!) гарэць.

Ёсць творцы (сучаснік!) тытаны! А ёсць — мурашы...
Людзейкі — з пясчынаў жыццейства, душой — галяшы,
Бяздарныя лёсы ж мана і хлусня ў кругаверць.

6

Бяздарныя лёсы ж мана і хлусня ў кругаверць...
Не кожнаму, людцы, прыходзіць пашана з прызнанняў,
Крывёй хто раманы пісаў — пазамеж развітанняў.
Аршанцу Ўладзіміру — памяццю яркай зырчэць.

Мінуламу (з возераў мужнасці!) не абмялець!
— Даруйце, празаік, за лірыкі горы — з маўчанняў...
Прыміце ў падзяку за талент — вянок з віншаванняў.
Пасля Караткевіча ўсёй Беларусі — мудрэць!

Зноў жніўны Іспас спаліць знічкі ў мурожнай траве.
Хрыстос да Гародні з'явіўся. Ноч — чоўнам плыве,
Куміру з народа — груз славы цяпер адалець.

Пакровам-асеннім трывожліва з солкасці вейк...
Ад зерніва Вечнасці — парасткі ў заўтрашні век, —
Прарочаму позірку ў зоры святлынна глядзець!

7

Прарочаму позірку ў зоры святлынна глядзець:
Ад Брэста да Мінска і Оршы скрозь Віцебск, Сафію,
Скрозь Полацк, царкву Еўфрасінні (з царкоўных сапфіраў).
Славянскую сцежу — вякам скрозь вякі адалець,

Вясне абуджацца. І ружам наноў чырванець.
Не ўсё, што ў падзеях і датах — міраж, атрафія...
Адчэрні, Чарнобыль! Палеская, згінь, лейкемія!
(Прызнанне ў Любові нашчадкам — не моўная клець!)

Я веру, што будзе праспект Караткевіча ў Мінску!
Вянок віншавальных санетаў: верш-спеў абеліску —
На плошчы сталічнай. Аркестр роднай музыкі-Мовы.

О вечалле — словы! Разгучань: з чырвеннага дыску.
Ад сонечнай плазмы. З галактыкі даляў. (Не зблізку).
На дзень нараджэнняў — абрус засцілаюць ільновы.

8

На дзень нараджэнняў — абрус засцілаюць ільновы.
Пясняр Караткевіч! Сястра Ваш ахоўвае дом.
Наталлі Сямёнаўне дзяч, мой санеце, радком.
Адводзь, Муза, долі — ад стэпу, з Дарог палыновых.

Хто з класікай поруч — адгневіць (пустэльных!) размовы,
Адорыць айчыну з бацькоўскага краю святлом.
Хто п'е з настальгіі пітво — пракаўтне (з болю!) ком,
Духоўнасць — той хлеб, што не будзе нікому дармовым.

Згадаць, Уладзімір Сямёнавіч, хто Вы — цяпер?
Для тых, хто ў мяшчанскім картузіцца тлушчы-цяпле,
З імёнамі злымі?! Не хопіць — ні літар, ні гукаў.

Павер у духоўнае заўтра, славянства, павер!
Не кожнага творцы сумленне, як чысты чацвер, —
Святоўнае ў кладзезь Радзімы кладуць без прынукаў.

9

Святоўнае ў кладзезь Радзімы кладуць без прынукаў.
О колькі ў мастацкім падвор'і шумлівым пісак!
Ад чорнасці іх — не адвучыць ніхто і ніяк:
Гісторыі смеласць, бяспамяцтва горкае ўнукаў.

Двурушнасць. І ў шэра-дзіравым адзенні — дакука.
Што могуць пляткарствы? Пытальнікі. Клічнасцей знак.
(Зайздрослівых гнеў, як ссіпелы ў канаве гусак!)
З фальшывага сэрца — фальшывы з крыві пульсу грукат.

Памкненні мастацкіх ляніўцаў — з нікчэмнасці лёсаў,
З каменлівых дзеяў і з жоўта-раскрыленых восаў.
Паўзуць рыфмачы следам талентаў слізкай гадзюкай.

Смерць-яд выпускаюць. Шыпяць. І хрыпяць безгалоса,
Расцягваюць нервачкі-кроў, як жалезненькім тросам.
Гісторыя звеку (мужнарская ў мужнасць!) навука.

10

Гісторыя звеку (мужнарская ў мужнасць!) навука.
— Даруйце, пісьменнік, што воблік разбуджваю Ваш...
Адвечар стагоддзя — з шэкспіраўскай драмы — кірмаш.
Сцярпелі мастацкія лёсы (да выцерпу!) мукаў.

Так з лодкі падводнае "Курск" з-пад затопленых люкаў
Салёная пашча трагедыі ў зрок прагне наш.
Шторм-глыбы марскія іграюць жалоблівы марш.
І ў вочы планеты ўзіраюцца смерцю-падлюкай...

Каменны Валун над магілаю Вашай — Знаменнем!
Плод-зерніва з коласа Памяці сыплецца ў жмені.
Аршанскі прарок Караткевіч. Вы — з зоркасці слоў!

Выбраннікаў Бога — не ставіць бяда на калені.
Вы нашай духоўнасці — спелая поўня. Праменні, —
Вянок беларускіх санетаў — з класічных высноў!

11

Вянок беларускіх санетаў — з класічных высноў!
Для Вас, Уладзімір Сямёнавіч, верш мой святкуе.
Партрэт Караткевіча фрэскамі гукаў малюе.
Вы — той, без каго — песням сумна вяртацца дамоў...

Нацешаны ўволю адспелачкі грэшных размоў.
І чым толькі творчая чэлядзь, чытач, не гандлюе?
З любоўю і верай пачварна і гідка махлюе.
Пра свет чорна-белы — і Небу здаволена слоў.

Спакойлівы — талент. Разважны. Сумяціцы — лішні.
З народнаю мудрасцю. Звання і лаўрам суцішны.
Духоўную спадчыну Час перадорвае ўнукам.

12

Духоўную спадчыну Час перадорвае ўнукам.
Ад матчыных Песень мудрэюць паэтаў радкі...
Санет Караткевічу — з жытніх калоссяў вянкі —
Азорваць пісьмовасць Скарыны — мастацкая штука.

Стаміўся адвечарань веку ад ляскату з брукаў.
Ідуць да славутых імёнаў штодня хадакі.
Плывуць і плывуць скрозь падзеі надзей чаўнакі.
Не зболена болень. Не скрышана ў смецце дакука.

Гайдаецца Вечнасць калыскаю для немаўляці.
Ваш дзень, Уладзімір Сямёнавіч, вершам вітаці:
Бацькоўскаму краю. І Мінску. І слынным навукам.

Радзіму ўпрыгожваць жыццём. І жыццё прадаўжаці.
Друкарскую ніву старонкамі кніг засяваці.
Да Мовы крок таленту юных — дзяржаўнай зарукай...

13

Да Мовы крок талентаў юных — дзяржаўнай зарукай...
Вясной што пасееш — па восені выспее ў плод.
Шчаслівае долі мой варты — былінны народ.
Пагляд Караткевіча — голуб у пары: з галубкай.

Дваццаты век коламі грозных падзеяў адгрукаў.
Паром двух стагоддзяў. Імклівых падзей незварот.
Масты скрозь мінулае ладзяць з музычнасцю нот.
Двухтысячны год сто арэляў сваіх адбаюкаў.

Я знаю, што лепшае ў заўтрашнім, новым,
Цалую ўсе літары-гукі матулінай Мовы.
Да кожнае думачкі-думы і зернейка слоў.

Прывець, мой чытача, лірычную светласць размовы
Пад школьны званок і туман каля воч вераснёвы.
— Пясняр, Уладзімір Сямёнавіч! Добры дзень зноў!

14

Пясняр, Уладзімір Сямёнавіч! Добры дзень зноў!
Век — талентам Вашым абмервае межы стагоддзяў.
За іменем Вашым Славянства ў Духоўны храм дойдзе,
А ўсё мітульговае ў свеце — пад ногі. Далоў!

Вяртайся, гісторыя, ў датах і ў кветках дамоў.
Пра мужных — нашчадак том з кніжнаю памяццю знойдзе
Пад вокладкай велічных дзей і падзей (не ў горадзе?)
Мастацкая праца — з мазольных і смольных акоў.

Вянок з віншавальных санетаў для Оршы ў дарунак
Я ў Дзень Караткевіча, што з лістападаўскіх струнак,
Да ружаў (з агню!) юбілейных — далучваю ў Словы.

Народны пісьменнік! Радзімы і Мовы вястунак.
За вокнамі Мінска — дождж з клёнаў, сустрэчы вястунак
Стагоддзя апошнюю восень святкуюць Пакровы.

15

Стагоддзя апошнюю восень святкуюць Пакровы.
Паэтаў жыццё — апярэджвае Час. Нішчыць смерць.
На поўныя грудзі дыханне ў прарокаў. Не ледзь.
Званамі звіняць Караткевіча ў Заўтрае словы.

Настаўнікаў нацыі: (лёс!) да радка — мазалёвы.
Бяздарныя лёсы ж з маны і хлусні ў кругаверць.
Прарочаму позірку ў зоры — святлынна глядзець,
На дзень нараджэнняў абрус засцілаюць ільновы.

Святоўнае ў кладзезь Радзімы кладуць без прынукаў.
Гісторыя звеку (мужнарская ў мужнасць) навука.
Вянок беларускіх санетаў — з класічных высноў.

Духоўную спадчыну час перадорвае ўнукам.
Да Мовы — крок талентаў юных дзяржаўнай зарукай.
— Пясняр, Уладзімір Сямёнавіч! Добры дзень зноў!

аўтограф

Анжаліка АГУРБАШ:

“НЕ ЗАБЫВАЙ МЯНЕ, МАЯ КРАІНА...”

У жыцці і творчасці папулярнай беларускай спявачкі Лікі Ялінскай пачаўся новы, “маскоўскі” перыяд пасля таго, як яна пакахала і выйшла замуж за вядомага ў Расіі прадпрымальніка Мікалая Агурбаша. А свой “мінскі” перыяд спявачка заканчвае альбомам “Развітальны пацалунак Лікі Ялінскай”, прэзентацыя якога адбылася ў лістападзе ў Мінску ў музычнай краме “Містэрыя гуку”. Прыгажуня з задавальненнем адказвала на пытанні паклоннікаў і журналістаў.

– Анжаліка, як ствараўся апошні альбом, якія песні ўвайшлі ў яго?

— Альбом пачынаюць песні, напісаныя паэтам і кампазітарам Ігарам Цімаковым. "Белая Русь" ужо палюбілася беларусам, у гэтым творы ўсе мае пачуцці да Радзімы. Наступныя песні альбома: "Я і ты", "Шалёнае каханне", "Мядовы месяц" і "Чао, Парыж" — быццам бы падняліся на крылах кахання. Яны былі запісаны ў маскоўскай студыі Аляксандра Кальянава. Але аснову альбома складаюць песні беларускага перыяду: "Танга", "Рок-н-рол", "На пероне дождж", "Скрыпач". Яны напісаны беларускім кампазітарам Ізмаілам Капланавым, і паэтамі Алегам Жукавым і Уладзімірам Туманавым.

Песню, якая дала назву альбому, напісала я сама. У час працы ў студыі Беларускага радыё і тэлебачання мой генеральны прадзюсер сказаў: "Усё цудоўна, але не хапае адной, самай галоўнай песні. Песні, якая была б развітальным пацалункам Лікі Ялінскай... У гэты час у мяне і нарадзіліся радкі:"Я посылаю вам прощальный поцелуй...". Яна стала кульмінацыйнай песняй альбома. Наогул, дыск з гэтым альбомам эксклюзіўны, толькі для беларусаў. Я буду шчаслівай, калі ён закране чыю-небудзь душу, дапаможа некаму справіцца з яго жыццёвымі сітуацыямі.

Песень атрымалася 13 — гэта лічба шчаслівая для мяне. Я ўжо 13 гадоў у мастацтве, а некалі з нумара 313 пачалася мая творчая кар'ера, калі я стала пераможцай першага конкурсу "Міс Беларусь".

– Нам вядома, што вы заваявалі тытул “Місіс Расія”, але чамусьці не прынялі ўдзел у конкурсе “Місіс Свету”, да якога рыхтаваліся...

— Конкурс "Місіс Расія" праводзіцца штогод. Пасля перамогі на конкурсе, у якім я ўдзельнічала пад імем Анжалікі Агурбаш, быццам бы пачала жыццё нанава. З таго часу і на сцэне я выступаю пад гэтым імем. Што тычыцца конкурсу "Місіс Свету", то ў ім я не ўдзельнічала па шэрагу прычын, але захавала за сабою права змагацца за тытул "Місіс Свету" наступны раз.

– Развітанне заўсёды пакідае смутак на сэрцы...

— Не, я не развітваюся з беларускай публікай, я кажу — да новых сустрэч з Анжалікай Агурбаш. Беларусь — мая душа, з ёю не расстануся. Вельмі сумую па Радзіме. Тут мае родныя, сябры, паклоннікі.

Зараз працую над новым альбомам, які будзе называцца "Я гарантую рай". Па вясне плануем гастролі па Беларусі, якія будуць мець назву такую ж, як і альбом. Маршрут яшчэ абмяркоўваецца. Адно магу сказаць з упэўненасцю, што горад Калінкавічы ў спісе будзе абавязкова. Аказваецца, нават там ёсць мой фанклуб. Нядаўна разам з аднадумцамі ездзіла туды ў час акцыі "За здаровы лад жыцця". Адбылася вельмі цёплая гутарка.

– А самі вы як клапоціцеся пра сваё здароўе?

— Я не п'ю, не куру, займаюся спортам. Гледзячы, як муж баксіруе, паспрабавала сама і захапілася боксам, люблю катацца на конях.

– А ці прытрымліваецеся правільнага харчавання і як захоўваеце фігуру?

— Я ем усё, чаго хочацца. У мяне вельмі насычанае жыццё, заўсёды ў руху, таму энергіі спальваецца многа, і фігура застаецца ў норме. Плюс яшчэ заняткі спортам.

– Ці адчуваеце вы сябе масквічкай?

— Я нарадзілася ў СССР і да гэтага часу лічу сябе грамадзянкай вялікай і моцнай краіны. А сувязь Расіі і Беларусі ніколі не перарывалася. На Беларусі засталася мая душа, а ў Расіі я знайшла сям'ю і спакой.

Я вельмі рада, што маю прыхільнікаў на Беларусі.

Святлана КАРПУЧОК.

дзіцячая чытанка

УРОКІ ДЗЕДА УСЁВЕДА

Добры дзень, мае дарагія хлопчыкі і дзяўчынкі, мамы і таты, бабулі і дзядулі, настаўнікі і настаўніцы! Я зноў з вамі. Сёння прапаную ўрок:

ДАРОГА. ТРАНСПАРТ. РУХ

Падкрэсліце словы, з якімі вы сустрэліся ўпершыню. Запомніце іх, складзіце з імі сказы.

Рух – движение.
Чыгунка – железная дорога.
Электрычка – электричка.
Лаўка – полка (в вагоне).
Месца – место.
Самалёт – самолет.
Вакзал – вокзал.
Станцыя – станция.
Прыпынак – остановка.
Гарадскі транспарт – городской транспорт.
Кампасціраваць білет – компостировать билет.
Пярэднія дзверы – передняя дверь.
Уваходзіць – входить.
Выходзіць – выходить.

Малюнак Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.

***

Запомніце ўжыванне выдзеленых слоў.

У беларускай і рускай мовах паняцце слоў вуліца і улица, як вядома, агульнае. Аднак не ўсе значэнні гэтых слоў супадаюць. І сказ "Бери мяч и поиграй на улице" не перакладзеш "Бяры мяч і пагуляй на вуліцы", бо па-беларуску вуліца там, дзе імчаць машыны, і на вуліцы было б гуляць небяспечна.

Па-беларуску гуляць на дварэ — значыць, на ўчастку, пляцоўцы пры доме (хаце), будынку.

Дарэчы, запомнім і будзем адрозніваць гэтае словазлучэнне на двары ад другога, блізкага — на дварэ, што абазначае ўвогуле — на адкрытым паветры, не ў хаце: На дварэ холад, сцюжа.

***

Самым першым "прадзедам" аўтамабіля была каляска на паравой цязе (рухалася сама). Яе сканструяваў афіцэр швейцарскай арміі Плантэр. І сёння яна знаходзіцца ў адным з швейцарскіх музеяў.

***

Самыя першыя дарожныя знакі з'явіліся на вуліцах Парыжа ў 1903 годзе. Яны былі квадратныя, белыя на чорным фоне. У той час дзейнічала 9 знакаў. У нашай краіне такімі знакамі сталі карыстацца толькі ў 20-я гады. Так, у 1927 годзе было 6 знакаў, у 1933 — 22, у 1964 — 78. А зараз іх налічваецца звыш 150.

ЗАГАДКІ

З месца не зрушыцца, а на сабе многа чаго носіць. (Мост.)

За лесам лясанскім, за полем палянскім, там гукала Кацярына голасам шатанскім. (Цянік.)

Двое вачэй наперадзе, імчыць па вёсцы і горадзе. А як не наесца — не рушыць ні з месца. (Аўтамабіль.)

Прыйшоў хтось, узяў штось, пайшоў бы шукаць, ды следу не знаць. (Чалавек і лодка.)

На гэтым я заканчваю свой урок. Спадзяюся, ён вам спадабаўся. Да новых сустрэч!

Падрыхтавала **Святлана КАРПУЧОК.**

захавай традыцыю

“СЯБРЫНА” — КЛУБ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ І ДЗЯЦЕЙ

У Мінскім палацы дзяцей і моладзі распачаў сваю работу ў новым навучальным годзе сямейны клуб “Сябрына”, які аб’ядноўвае больш за 12 сем’яў, каля 60 чалавек. Экскурсіі, вандроўкі, вечарыны і конкурсы, сумеснае наведванне выстаў, прэзентацыі кніг адбываюцца кожную нядзелю. Сумесны адпачынак з бацькамі, знаёмства з гісторыка-культурнымі помнікамі, уключэнне ў сучаснае культурнае жыццё сталіцы ўзбагачае духоўны свет дзяцей, мацуе сем’і. Усе ў клубе гавораць на беларускай мове і набылі сяброў-аднадумцаў.

На працягу трох гадоў пабывалі на радзіме Янкі Купалы і Якуба Коласа, у старажытным Заслаўі, Гродне, Лідзе, Смаргоні, Слоніме, Ружанах, Косаве, наведалі замкі ў Міры і Навагрудку, Крэве, сядзібу Агінскага ў Залессі, магілу Багушэвіча ў Жупранах. І ўсе маршруты распрацавала сама Ірына, запрашаючы вопытных экскурсаводаў — знаўцаў нашай спадчыны. Нядаўна адбылася вандроўка ў Ракаў, у Івянец да тамтэйшых ганчароў, іншых рамеснікаў.

Падчас паездкі наведалі магілы Каруся Каганца і Дуніна-Марцінкевіча, вёску Скірмунтова ў Дзяржынскім раёне, дзе самае высокае месца на Беларусі, сустрэліся з мясцовымі краязнаўцамі. У гэтым навучальным годзе "Сябрына" вывучае гісторыю Мінска і ваколіц. Удзельнікі клуба пабывалі шмат у якіх музеях, на выставах, ладзяць канцэрты і танцавальныя вечарыны з удзелам музыкантаў, што граюць на дудзе, скрыпцы і іншых народных інструментах. Працягваецца праца па вывучэнні сваіх радаводаў.

Штогод у клубе "Сябрына" ладзяцца вечарыны-прэзентацыі кніг, сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі, мастакамі. Цікавыя вандроўкі адбыліся ў вёску Прылукі пад Мінскам, на былую сядзібу Чапскіх, у Лошыцкі парк. Менавіта ў гэтым клубе ўпершыню адбылася прэзентацыя мультфільмаў "Дысней па-беларуску", на якую прыйшлі акцёры, што іх агучвалі. А як цікава праходзяць Дзяды, калядныя вечарыны і іншыя святы паводле народнага календара! На конкурсах малюнкаў і любімай сямейнай песні кожны мог выявіць свае творчыя здольнасці.

Стваральніца і кіраўніца "Сябрыны" Ірына Марачкіна ўпэўнена, што разам бацькі і дзеці справяцца з любымі цяжкасцямі жыцця, абапіраючыся на традыцыі і культуру сваёй Бацькаўшчыны, шматвяковую спадчыну продкаў.

Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

экалогія

ЗЯЛЁНЫ ПОГЛЯД

На Міжнародным фестывалі экалагічных фільмаў “Зеленый взгляд-2003”, які праходзіў у Санкт-Пецярбургу, адзначаны дзве работы беларускага рэжысёра Ігара Бышнева.

Карціна "Жабы на дарогах" стала прызёрам у намінацыі "Лепшая стужка для дзяцей і юнацтва", а маладзёжнае журы аднесла яго карціну "Апошнія арлы" да катэгорыі "вельмі добрых і чалавечных".

Лепшыя работы экалагічнага кінематографа, прадстаўленыя на фестывалі, сталі своеасаблівым даследаваннем экалагічнага стану ўсёй планеты. У конкурсе прынялі ўдзел кінематаграфісты з 29 краін свету, якія прадставілі на суд журы і гледачоў 53 стужкі. І вельмі прыемна, што сярод такой колькасці фільмаў адзначаны работы беларускага рэжысёра. Яго карціна "Жабы на дарогах" расказвае пра незвычайны маладзёжны лагер па ратаванні жаб...

Наступае вясна, і жабы, падпарадкоўваючыся інстынкту, паўзуць з месцаў зімовак да вадаёмаў, дзе ў іх праходзяць шлюбныя гульні і самкі адкладваюць ікрынкі. Сёння шляхі жаб перакрыжоўваюцца з аўтамабільнымі дарогамі... У 2001 годзе ў Бярэзінскім біясферным запаведніку грамадская арганізацыя "Ахова птушак Беларусі" арганізавала першы лагер па ратаванні мігрыруючых амфібій. І з таго часу кожную вясну студэнцкія лагеры актыўна працуюць у гэтым напрамку ў Бярэзінскім запаведніку, Прыпяцкім нацыянальным парку, Белавежскай пушчы. З'явіліся першыя ў краіне дарожныя знакі "Увага! Жабы!"

Наталля ЦЕЦЯРЭЎСКАЯ.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82, (тэл./факс).
Галоўны рэдактар: 8029-6-88-17-82. E-mail: golas_radzimy@tut.by

ЧЫТАЙЦЕ «Голас Радзімы» Ў ІНТЭРНЭЦЕ:
http://golas.promedia.by

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж 2 154 экз. Заказ 1527. Падпісана да друку 2. 12. 2003 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе. Знакам (R) пазначаны рэкламныя матэрыялы.

Аддрукавана на паліграфічным РУП «Чырвоная зорка» (220073, г. Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3).

АКТУАЛЬНА
ТРАНЗІТ ПРАЗ БЕЛАРУСЬ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА 2 стар.
АБІТУРЫЕНТ–2004
НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў ВНУ 2 стар.
ВЕСТКІ З СУПОЛАК. КАЗАХСТАН 3 стар.

НАПЯРЭДАДНІ
ФОТАМАСТАКІ СТВАРАЮЦЬ ТВОРЧЫ САЮЗ 4 стар.
ДЫПКУР'ЕР 3 стар.
ВЕРНІСАЖ
"ТЭМЫ" МАСТАКА Станіслава КІЧКО 4 стар.

КАНТАКТЫ І ДЫЯЛОГІ 5–6 стар.
З ПОШТЫ Яўгена ЛЕЦКІ
ПОЛЬСКІЯ ЎРАЖАННІ АБ XXX СУСТРЭЧЫ СЛАВЯНСКАЙ МОЛАДЗІ 7 стар.
ДЭБЮТ
КАЗКІ Ірыны ШПАКОЎСКАЙ 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА **РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ**

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі **Выдаецца з 6 красавіка 1955 года**

11 снежня 2003 года, № 50 (2868) Цана 175 рублёў E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

ПРЭЗІДЭНТ СУСТРЭЎСЯ З ДЭПУТАТАМІ

Адна з найважнейшых задач, якая стаіць перад краінай і ўрадам на 2004 год, – гэта мадэрнізацыя эканомікі, аб'ём інвесціравання ў якую павінен павялічыцца не менш як на 20 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам.

Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў. У цэнтры ўвагі былі пытанні, звязаныя з прыняццем бюджэту на будучы год.

Як падкрэсліў Прэзідэнт, ён па традыцыі сустракаецца з дэпутатамі двойчы на год — калі выступае з пасланнем да парламента і беларускага народа і другі раз, каб абмеркаваць шэраг пытанняў. На думку Аляксандра Лукашэнкі, на гэты раз дэпутаты ў адрозненне ад мінулых гадоў вельмі актыўна працавалі з урадам пры распрацоўцы бюджэту на будучы год і належным чынам падрыхтаваліся да прыняцця гэтага важнага дакумента. Прэзідэнт адзначыў, што калі дэпутаты маюць намер павялічыць фінансаванне па якіх-небудзь накірунках, то павінны рэальна прапаноўваць крыніцы, адкуль гэтыя грошы ўзяць. Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз акцэнтаваў увагу на важнасці задач, якія трэба ажыццявіць у наступным, вызначальным годзе гэтага пяцігадовага перыяду, бо ад яго залежыць развіццё нашай краіны ў перспектыве.

ЦЭНТР ПАДЗЕЙ — ВІСКУЛІ

Фота БелТА.

1991 год — кіраўнікі суверэнных дзяржаў: Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі і Украіны — падпісалі пагадненні аб дэнансацыі дагавора аб стварэнні Саюза ССР ад 1922 года і аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (дакументы падпісаны ў рэзідэнцыі Віскулі ў Белавежскай пушчы).

ЭКСКЛЮЗІЎНЫ "БРЫЛЬЯНТ БЕЛАРУСІ"

Калектывам рэспубліканскага алмазаапрацоўчага унітарнага прадпрыемства "Гомельскае ВА "Крышталь" пачата падрыхтоўка вытворчасці унікальных ювелірных вырабаў, у якіх будуць выкарыстаны ювелірныя ўстаўкі з найноўшага айчыннага матэрыялу – алмазоту.

Серыйны выпуск гэтага звышцвёрдага высокатэхналагічнага штучнага матэрыялу пачаты пад Мінскам, дзякуючы актыўнай падтрымцы ўрада краіны.

Для ювелірнай апрацоўкі алмазоту адбіраюцца толькі найлепшыя ўзоры яго, бездакорныя па памерах, структуры, якасці і колеру. У выніку атрымліваецца рарытэтнае сямейства ювелірных вырабаў, якое мае камерцыйную назву "Брыльянт Беларусі". Ён будзе забяспечваць ці пераўзыходзіць усе спажывецкія аптычныя якасці традыцыйных брыльянтаў, а вырабы з яго будуць адзінкавымі. Плануецца, што пастаўка эксклюзіваў першапачаткова будзе ажыццяўляцца толькі на айчынны рынак.

"ЮБІЛЕЙНЫЯ ЗВАНЫ" НІНЭЛЬ ШЧАСНАЙ

Персанальная выстава заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, вядомай мастачкі Нінэль Шчаснай праходзіць у Палацы мастацтва ў Мінску. На вернісажы прадстаўлена больш за 100 карцін. Прысвячаецца выстава 70-годдзю мастачкі і названа "Юбілейныя званы".

Нінэль Шчасная працуе ў жанры партрэта, пейзажа, нацюрморта, а таксама ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, у станковай і кніжнай графіцы. Яна стварыла цэлую галерэю партрэтаў нашых вядомых землякоў, сярод якіх Іван Шамякін, Іван Мележ, Пётр Клімук. Творы Нінэль Шчаснай не раз дэманстраваліся ў Беларусі і за мяжой. Яна ўзнагароджана медалём "За заслугі ў выяўленчым мастацтве" і з'яўляецца ганаровым грамадзянінам Полацка.

РАЎБІЧЫ РЫХТУЮЦЦА ДА ЧЭМПІЯНАТУ ЕЎРОПЫ

У лютым будучага года ў алімпійскім спорткомплексе "Раўбічы" пройдзе чэмпіянат Еўропы па біятлону.

Тут праведзена рэканструкцыя зімовага стадыёна, пабудавана за кароткі тэрмін біятлонная траса. Яе шырыня ад шасці да васьмі метраў, што дазваляе праводзіць спаборніцтвы як па класічным зімовым біятлоне, так і летнія турніры па гэтым відзе спорту. Прыведзена ў парадак гасцінічная гаспадарка, абсталёўваюцца пляцоўкі для машын.

Нядаўна тут пабывалі эксперты Міжнароднага саюза біятланістаў і высока ацанілі падрыхтоўку да мерапрыемства.

Падрыхтавала **Галіна ВІДАНАВА.**

справы вясковыя

Фота БелТА.

НАВАСЁЛ З СУМАРОКАВА

Сельскагаспадарчае прадпрыемства "Авангард", што ў Магілёўскім раёне, вядзе актыўнае будаўніцтва жылля.

У вёсцы Сумарокава ўзводзіцца пасёлак з 12 дамоў для галоўных спецыялістаў гаспадаркі. У снежні здадзены ў эксплуатацыю 4 двухпавярховыя жылыя дамы і закладзены падмурак яшчэ двух.

НА ЗДЫМКУ: інжынер Васіль СТЭЛЬМАХАЎ з сям'ёй ужо пераехаў у новы дом.

зваротная сувязь

РАСІЯ – ЦЮМЕНЬ

МАРА ЗБЫЛАСЯ

Добры дзень, паважаная рэдакцыя газеты "Голас Радзімы"!

Трымаю ў руках вашу газету з матэрыялам Іны Кандаўравай "Там, за Уралам, — Белая Русь..." Дзякуй!

Паездка ў Беларусь для нашага калектыву — падарунак лёсу. Мы вельмі доўга ішлі да гэтага. А якім было наша шчасце, калі нас пачулі. Ну што ж, мара збылася! Цяпер мы расказваем пра нашу паездку, пра свае ўражанні на старонках нашых газет: і раённай, і абласных.

Так атрымалася, што ў лютым 2003 года я напісала ў газету "Тюменская правда сегодня" пра сваю вёску, сваю мару, а ў пачатку ліпеня гэтага года паведаміла, што варта марыць, што збылася наша мара! Пра гэтую цудоўную паездку расказвалі журналісты газет "Тюменские известия" (Наталля Цераб) і "Красная звезда" (Валянціна Хакімава).

У нашых жанчын да гэтага часу гараць вочы, калі згадваюць, як была арганізавана паездка, як нас сустрэлі і як нам пашанцавала, што побач з намі быў выдатны чалавек, які сагураў сваёй добразычлівасцю, непасрэднасцю, уражваў веданнем гісторыі Беларусі. Гэта Уладзіслаў Мантвідас. З ім адчувалі сябе, як дома!

Хачу сказаць, што ўразіла дабрыня ўсіх, хто сустрэўся нам у Беларусі. Дзякуй усім за гэта! Дзякуй жыхарам вёскі Шэйка Крупскага раёна за гасціннасць. Дзякуй жыхарцы гэтай вёскі Ніне Сёмінай за песню, якой нас навучыла. Яна назаўсёды застанецца ў нашым рэпертуары.

Мы марым пра новую сустрэчу на зямлі беларускай. А пакуль пастараемся захоўваць традыцыі сваіх продкаў.

З павагай

Валянціна МІХНЕНКА,
кіраўнік ансамбля "Вячоркі",
в.Вікулава.

спорт

ЦЯЖКАЯ АТЛЕТЫКА. У канадскім Ванкуверы завяршылася першынство планеты, на якім разыгрываліся і алімпійскія ліцэнзіі.

Беларусы вярнуліся дадому з сямю ўзнагародамі: "золатам", "серабром" і пяццю "бронзамі". Дзякуючы гэтаму, прадстаўляць нашу краіну ў Афінах будуць пяць мужчын і тры жанчыны.

ХАКЕЙ. Мінскі клуб "Керамін" заваяваў права выступаць у суперфінале Кантынентальнага клуба. Гэта стала магчымым пасля перамогі нашых спартсменаў у Лінцы, дзе беларусы абыгралі фінскі "Йукурыт" — 4:1, мясцовы клуб "Блэк Уінгз" — 3:1 і падзялілі ачкі з казахстанскім "Казцінк-Тарпеда" — 1:1.

МАСТАЦКАЯ ГІМНАСТЫКА. Фінал Гран-пры ў аўстрыйскім Інсбруку завяршыў сезон спаборніцтваў у гімнастак. Апошні акорд выдаўся ўдалым для беларусак у практыкаваннях з мячом: Святлана Рудалава стала чацвёртай у мнагабор'і, а на рахунку Іны Жукавай сёмая пазіцыя ў гэтым відзе плюс "бронза" ў практыкаванні з мячом.

ФУТБОЛ. Стала вядома, што нацыянальная зборная Беларусі пад кіраўніцтвам Анатоля Байдачнага пачне адборачны цыкл да чэмпіянату свету 2006 года ў групе 5. Сапернікамі нашай дружыны будуць каманды Італіі, Славеніі, Нарвегіі, Шатландыі і Малдовы.

НАСТОЛЬНЫ ТЭНІС. У Люксембургу, на кваліфікацыйным перадалімпійскім турніры вызначыўся другі спартсмен, які будзе прадстаўляць Беларусь у Афінах разам з Уладзімірам Самсонавым у адзіночным разрадзе. Уладальніцай запаветнай пуцёўкі стала Вікторыя Паўловіч, якая атрымала пяць перамог у пяці матчах.

Міхаіл МАЗАКОЎ.

нумізматам

Фота БелТА.

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь 8 снежня 2003 года ўвёў у абарачэнне памятныя манеты "Спаса-Праабражэнская царква" серыі "Помнікі архітэктуры Беларусі": сярэбраную – наміналам 20 рублёў і медна-нікелевую – наміналам 1 рубель.

Тыраж іх па 2 000 штук.